СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫМ ГОДЗЕ!

Заканчваецца падпіска на II квартал 2008 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы	на 6 месяцаў
63850 (індывідуальны)	**8800**	**26400**	**52800**
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**8300**	**24900**	**49800**
63858 (ведамасны)	**14000**	**42000**	**84000**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**12800**	**38400**	**76800**

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 САКАВІКА 2008 г. АЎТОРАК

№ 56 (26169)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прэзідэнт Беларусі наведаў галоўны каталіцкі храм у Мінску

Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка з нагоды другога дня святкавання Вялікадня паводле каталіцкага календара наведаў мінскі Архікафедральны касцёл Імя Найсвяцейшай Дзевы Марыі.

Кіраўнік дзяржавы сустрэўся з Архіепіскапам Мітрапалітам Мінска-Магілёўскім Тадэвушам Кандрусевічам. Аляксандр Лукашэнка агледзеў адрэстаўраваныя размалёўкі храма, якія аднаўляліся на працягу некалькіх гадоў пры падтрымцы дзяржаўных уладаў і самога Прэзідэнта.

У час наведвання касцёла адбылася размова Аляксандра Лукашэнкі і Тадэвуша Кандрусевіча ў фармаце сам-насам.

Прэзідэнт Беларусі і кіраўнік Мінска-Магілёўскай архіепархіі РКЦ абмяняліся падарункамі. Кіраўніку дзяржавы быў уручаны памятны медаль, у сваю чаргу Аляксандр Лукашэнка падараваў архікафедральнаму касцёлу карціну «Касцёл у Жупранах» мастака Эдуарда Рымаровіча (на карціне адлюстраваны каталіцкі храм у гонар святых апосталаў Пятра і Паўла ў Ашмянскім раёне).

Рымска-каталіцкая канфесія — другая па велічыні ў Беларусі. Цяпер у краіне налічваецца 457 каталіцкіх прыходаў, аб'яднаных у чатыры епархіі.

БЕЛТА.

Узровень дабрабыту — самы справядлівы крытэрый сацыяльнай падтрымкі

Такую думку выказала 23 сакавіка ў эфіры Першага нацыянальнага тэлеканала намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля Пяткевіч.

Паводле яе слоў, у Беларусі льгота пачала ўспрымацца як узнагарода за заслугі не толькі самому чалавеку, але і членам яго сям'і. «Але льгота — гэта дапамога, падтрымка таму, што мае ў ёй патрэбу, незалежна ад таго, да якой катэгорыі чалавек належыць. Пенсіянер пенсіянеру не роўны, і студэнт студэнту не роўны», — лічыць Наталля Пяткевіч.

Яна адзначыла, што адмена льгот — гэта аб'ектыўна няпросты працэс, які неабходна перажыць. «Але мы чамусьці выпускаем з-пад увагі тое, якую рэальную сацыяльную дапамогу кожнаму грамадзяніну аказвае і прадаўжае аказваць дзяржава», — падкрэсліла Наталля Пяткевіч.

«Купляючы талон на праезд за поўны кошт, мы зусім не аплачваем рэальны кошт праезду. Дзяржава аплачвае каласальны працэнт камунальных і медыцынскіх паслуг, кошт дзіцячых садкоў і падручнікаў. Гэта ўсё тое, што рэальна каштуе ў сто разоў больш», — дадала намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Яна пераканана, што адрасная дапамога больш пажаданая да патрэб канкрэтнага чалавека, які атрымлівае пэўную грашовую суму і мае права выкарыстаць яе, як лічыць патрэбным. «Прэзідэнт Беларусі вызначыў вельмі дакладную і правільную формулу ўзаемаадносінаў улады і чалавека: дзяржава — для народа, а чалавек — на карысць сваёй Айчыне», — рэзюмавала Наталля Пяткевіч.

«У дзяржавы ўзнікае неабходнасць забяспечыць роўнадаступнасць усіх тавараў і паслуг у краіне. Гэта не значыць, што павінна быць ураўнілаўка, але галоўнае, каб у кожнага чалавека была магчымасць набыць тавары або паслугі», — сказала Наталля Пяткевіч.

Паводле яе слоў, такая роўнадаступнасць забяспечваецца дзяржавай у розных формах. Па-першае, дзяржава павінна даць магчымасць грамадзянам працаваць і зарабляць. Па-другое, неабходна зрабіць так, каб не было дэфіцыту тавараў і паслуг. Па-трэцяе, калі чалавек знаходзіцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, то дзяржава павінна яму дапамагчы, незалежна ад таго, якога ён узросту, да якой сацыяльнай катэгорыі належыць, і нават незалежна ад яго заслуг перад краінай. «Менавіта ў гэтым заключаецца прынцып сацыяльнай справядлівасці. Дзяржава павінна клапаціцца пра кожнага свайго грамадзяніна», — падкрэсліла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Прывыкнуць да адсутнасці льгот складана з-за псіхалагічных фактараў, адзначыла Наталля Пяткевіч.

«Згадзіцеся, што чалавеку не проста з задавальненнем прыняць тое, што ў яго нешта было, а сёння гэтага няма, учора ён не плаціў за паслугу або тавар, а сёння яму даводзіцца плаціць 100 працэнтаў», — сказала Наталля Пяткевіч.

Яна лічыць, што льготы для кожнага асобнага чалавека — гэта вельмі міззярная сума, а калі гэтыя грошы кансалідаваць у рамках усёй дзяржавы, то кожны чалавек будзе мець значна больш. «Мы жывём у прынцыпова новых умовах. Краіна функцыянуе ў зусім іншых сацыяльна-эканамічных рэаліях, і з улікам гэтых рэалій і дзяржава павінна па-новаму прымаць адпаведныя рашэнні», — адзначыла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Так, паводле яе слоў, калі ў краіне штогод павялічваецца колькасць пенсіянераў, то ў дзяржавы ёсць альтэрнатыва: або павысіць пенсійны ўзрост, або адкарэктаваць той аб'ём ільгот і прывілей, часам неабгрунтаваных, які мелі пенсіянеры. Калі Беларусь купляе энерганосьбіты па цане ў 2-3 разы вышэйшай, чым некалькі гадоў таму, то кошт жыллёва-камунальных паслуг павінен узрасці. Дзяржава зноў становіцца перад выбарам: узняць кошт жыллёва-камунальных паслуг у 2-3 разы для ўсяго насельніцтва або зрабіць больш абгрунтаванымі льготы для тых, хто іх меў раней.

30 САКАВІКА ПЕРАХОДЗІМ НА ЛЕТНІ ЧАС

У Беларусі 30 сакавіка 2008 года будзе ажыццёўлены пераход на «летні» час у адпаведнасці з парадкам вылічэння часу, вызначаным пастановай урада ад 13 мая 1996 года № 317, паведамілі ў Дзяржстандарце Беларусі. У сувязі з гэтым 30 сакавіка 2008 года ў 2 гадзіны ночы стрэлкі гадзіннікаў пераводзяцца на адну гадзіну наперад.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ГУКАЛІ ВЯСНУ, А ПРЫЙШЛА... ЗІМА?

У НОЧ НА ПЯТНІЦУ — ДА МІНУС 13

У першай палове тыдня надвор'е ў нашай краіне істотна пагоршыць паўднёвы цыклон пад назвай «NANNI», які рухаецца цяпер з боку Венгерскай нізіны праз тэрыторыю Беларусі, — паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагназаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

Ужо ў аўторак цыклон прынясе да нас істотныя ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу, па ўсходзе краіны разам з дажджом. Уначы амаль паўсюдна, а ўдзень па ўсходзе ападкі моцныя. Месцамі слабая мяцеліца, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ў аўторак — мінус 3—плюс 3 градусы, па ўсходзе ўдзень — 4—9 цяпла.

У сераду ўначы снег чакаецца па ўсёй тэрыторыі краіны, удзень месцамі па паўночным усходзе снег моцны. Уначы ў асобных раёнах узмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы — 1—7 градусаў марозу, удзень — ад мінус 2 да плюс 3 градусаў.

Пачынаючы з чацвярга, на нашу тэрыторыю пачне паступаць халоднае паветра з боку Скандынавіі. Тэмпература паветра ўначы знізіцца да 3—10 градусаў марозу, у ноч на пятніцу пры прасняненні да мінус 13 градусаў; удзень — ад мінус 2 да плюс 5 градусаў.

У выхадныя да нас завітаюць паўднёва-заходнія вятры і стане цяплей. Тэмпература паветра ўначы ад 5 марозу да 3 цяпла, удзень у суботу — 1—7 градусаў цяпла, у Брэсцкай вобласці — да плюс 11 градусаў; у нядзелю ўдзень — 4—10 цяпла, па поўдні да плюс 12 градусаў. Сіноптыкі адзначаюць, што кароткачасовыя ападкі ў другой палове тыдня будуць назірацца толькі месцамі.

Сяргей КУРКАЧ.

Прамая лінія

УСЁ ПРА ДАПАМОГУ З АДРАСАМ

З моманту ўвядзення новых умоў аказання адраснай сацыяльнай дапамогі прайшло больш за тры месяцы. Між тым гэта тэма — па-ранейшаму на слыху. Хто можа і хто не можа разлічваць на адрасную падтрымку, на каго з членаў сям'і яна прызначаецца, як вызначаюцца выплаты, што такое сукупны даход і каэфіцыент уліку эфекту ад сумеснага пражывання? Аб усім гэтым і іншым мы прапануем вам пагутарыць падчас «прамой лініі» з **начальнікам упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянцінай Пятроўнай СЯРГЕЕВАЙ.**

Такім чынам, увага! Наша «прамая лінія» будзе праходзіць 28 сакавіка з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары (8 017) 287 17 57.

Цэны на камунальныя паслугі ў Беларусі ў 2008 годзе могуць быць павышаны

Аб гэтым 23 сакавіка ў эфіры беларускага тэлеканала АНТ заявіў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Уладзімір Белахвостаў.

«Лічу, што ў 2008 годзе яшчэ паўстане пытанне аб павышэнні тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі», — сказаў ён.

Паводле слоў міністра, прычынай росту цэнаў і тарыфаў заўсёды з'яўляецца змяненне сабекошту выпускаемай прадукцыі, а ў мінулым годзе адбыўся скачкападобны рост цэнаў на энергарэсурсы, якія выкарыстоўвае ў сваёй рабоце ЖКГ. «Так, цэны для прадпрыемстваў ЖКГ на газ выраслі ў 1,9 раза, на электраэнергію — на 22 працэнты», — адзначыў Уладзімір Белахвостаў.

Ён таксама расказаў, што ЖКГ пастаянна працуе над павышэннем энергаэфектыўнасці. Магчымасці і рэсурсы, якія ляжаць на паверхні, фактычна вычарпаны. «Далейшае зніжэнне затрат магчыма толькі за кошт тэхнічных мерапрыемстваў: укараненне энергазберагальнага абсталявання, замена адных відаў паліва на іншыя, механізацыя працэсаў на кацельнях. У нас шмат мерапрыемстваў. Кошт праграмы па энергазберажэнні сістэме ЖКГ цяпер складае амаль Br300 млрд», — дадаў Уладзімір Белахвостаў.

«Цяпер ЖКГ мае 3 млн асабовых рахункаў — гэта нашы дагаворы, па якіх мы абслугоўваем насельніцтва. Амаль 8 працэнтаў з іх дапускаюць неплацяжы або нават хранічныя неплацяжы», — сказаў ён.

Паводле слоў Уладзіміра Белахвостава, заканадаўства дазваляе працаваць з гэтай катэгорыяй грамадзян больш жорстка. Адна з формаў такой работы — спагнанне запазычанасці з працуючых асобаў у парадку натарыяльнага надпісу (у гэтым выпадку судовы выканаўца спаганяе доўг з заработнай платы). «На беспрацоўных або тых, хто не хоча працаваць, даводзіцца падаваць у суд, а ў якасці крайняй меры ў Беларусі, як і ў іншых краінах, выкарыстоўваецца высяленне», — адзначыў міністр.

Так, у 2007 годзе ў Беларусі былі выселены 304 сям'і. З іх з-за неплацяжоў — 162, а з-за псавання кватэры і месцаў агульнага карыстання — 142 сям'і. «Прычым суды часта прымаюць рашэнне аб высяленні без прадастаўлення іншага жылля. Як правіла, гэта людзі, якія вядуць амаральны лад жыцця. Прымаюцца меры па іх высяленні аж да таго, што ў далейшым іх па суду накіроўваюць у месцы пазбаўлення волі», — дадаў Уладзімір Белахвостаў.

Саўмін Беларусі ўстанавіў памеры датацый на пуцёўкі для дзяцей у аздараўленчыя лагеры на летніх канікулах

Адпаведная пастанова № 422 падпісана Саветам Міністраў.

Каментуючы па просьбе карэспандэнта БЕЛТА гэты дакумент, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Мікалай Мазур адзначыў, што ў перыяд летніх канікулаў змогуць адпачыць і папраўіць здароўе 430 тыс. беларускіх дзяцей. «Плануецца ахапіць 15 тыс. дзяцей, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, у тым ліку 5 тыс. дзяцей-сірот. Для гэтай катэгорыі дзяцей будуць выдзелены дадатковыя сродкі. Акрамя таго, 10 тыс. дзяцей з сем'яў, якія маюць патрэбу ў аздараўленні, будуць накіраваны ў аздараўленчыя лагеры за кошт сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь. Яшчэ 15 тыс. дзяцей з малазабяспечаных сем'яў будуць адпраўляцца ў аздараўленчыя лагеры за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў», — сказаў ён.

Па словах Мікалая Мазура, у гэтым годзе ў аздараўленні будуць задзейнічаны 1,5 тыс. дзяцей-інвалідаў, якія маюць патрэбу ў рэабілітацыі. Для іх будуць выдзелены 2 тыс. пуцёвак. Акрамя таго, 1,5 тыс. дзяцей-інвалідаў будуць адпраўляцца ў аздараўленчыя лагеры разам з бацькамі. Для гэтага будуць выдзелены 1,5 тыс. пуцёвак.

Са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацабароны, прадугледжаных у 2008 годзе на субсідыі і бягучыя трансферты, Br1,5 млрд будзе выдзелена на аказанне дапамогі ў падрыхтоўцы спартсацыянарных аздараўленчых лагераў да летняга сезона (у 2007-м — Br1 млрд). У тым ліку Брэсцкай вобласці Br174 млн, Віцебскай — Br260 млн, Гомельскай — Br120 млн, Гродзенскай — Br223 млн, Мінскай — Br198 млн, Магілёўскай — Br192 млн, гораду Мінску — Br333 млн.

За кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання ў лагерах з кругласутачным знаходжаннем правядуць адзін з канікулярных месяцаў 195 тыс. беларускіх школьнікаў, у тым ліку ў прафільных аздараўленчых лагерах рэспубліканскіх устаноў пазашкольнага выхавання і навучання, грамадскіх арганізацый — 23,2 тыс. хлопчыкаў і дзяўчынак. У лагерах з дзённым знаходжаннем (таксама за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання) гэтым летам адпачнуць 227 тыс. дзяцей. Работа такіх лагераў будзе арганізавана ў адну-дзве змены. У лагерах з кругласутачным знаходжаннем за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту будуць аздароўлены 8 тыс. дзяцей, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. З іх 6,5 тыс. юных жыхароў Гомельшчыны, 1 тыс. — Брэстчыны, 400 пуцёвак атрымаюць дзеці з Магілёўскай вобласці, 100 — з Гродзенскай вобласці.

ГАНДАЛЬ З ПЛЮСАМ

Паводле апошніх звестак Мінэканомікі, у студзені сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі Беларусі склалася станоўчым — 33,4 мільёна долараў ЗША. Нагадаем, што на гэты год прагназуецца адмоўнае сальда ў дыяпазоне 1400—1420 мільёнаў долараў. Сальда знешняга гандлю таварамі ў студзені было адмоўнае — 97,9 мільёна, паслугамі — станоўчае — 131,3 мільёна долараў. Характэрная асаблівасць знешняга гандлю ў цэлым па рэспубліцы за першы месяц — высокія тэмпы росту экспарту, якія на 23,1 працэнтнага пункта перавышаюць тэмпы росту імпарту. У выніку назіраецца паляпшэнне сальда ў параўнанні са студзенем мінулага года як па знешнім гандлі таварамі, так і ў гандлі паслугамі.

Ігар ГРЫШЫН.

Беларусь і карэйскія кампаніі абмяркоўваюць магчымасці супрацоўніцтва

Міністэрства прамысловасці Беларусі і карэйскія аўтавытворцы абмяркоўваюць магчымасці супрацоўніцтва. Аб гэтым заявіў прэм'-ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы з прадстаўнікамі карэйскіх кампаній.

Абмяркоўваюцца розныя варыянты супрацоўніцтва — пачынаючы з вытворчасці асобных кампанентаў і заканчваючы вытворчасцю грузавых аўтамабіляў сярэдняй танажнасці.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, у ходзе яго апошняга візіту ў Карэю ў канцы 2007 года былі абмеркаваны магчымасці ўдзелу карэйскіх кампаній у фінансаванні інвестыцыйных і інавацыйных праектаў у Беларусі. У першую чаргу гэта датычыцца праектаў у энергетычнай і банкаўскай сферах, ёсць цікавыя праекты ў медыцынскай галіне. Усяго на разгляд карэйскаму боку было перададзена звыш 10 праектаў.

Сяргей Сідорскі таксама нагадаў, што Беларусь актыўна супрацоўнічае і з іншымі карэйскімі кампаніямі, у прыватнасці LG. «Мы дамовіліся з прэзідэнтам кампаніі LG па краінах СНД сустрэцца ў бліжэйшы час у Мінску і абмеркаваць магчымасці вытворчасці LCD-панэляў у Беларусі. Нашы дагаворы з LG выконваюцца, першыя камплекты LCD-панэляў паступілі на «Інтэграл», дзе паспяхова ідзе іх зборка», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Паводле слоў Сяргея Сідорскага, ААТ «АСБ «Беларусбанк» і карэйская кампанія Goodmorning Shinhan Securities падпішуць мемарандум аб супрацоўніцтве.

Кампанія Goodmorning Shinhan Securities — адна з вядучых брокерскіх і інвестыцыйна-банкаўскіх устаноў Рэспублікі Карэя. Яна плануе выхад на рынак СНД, у тым ліку на рынак Беларусі ў мэтах удзелу ў рэалізацыі інвестыцыйных праектаў беларускіх арганізацый.

У ДТЗ ЗАГІНУЎ ДЫРЭКТАР

У Бабруйску 21 сакавіка ў выніку дарожна-транспартнага здарэння загінуў дырэктар завода звышбуйнагабарытных шын ААТ «Белшына» Яўген Хвалько.

У Магілёўскім УУС паведамілі, што аварыя адбылася ўдзень на вуліцы Мінская шаша. 45-гадовы дырэктар кіраваў машынай «Мерседэс-140». Ён выконваў манеўр абгону і не справіўся з кіраваннем. Аўтамабіль выехаў на ўзбочыну і наехаў на светлавую апору. Яўген Хвалько атрымаў смяротную траўму, а пасажыры — намеснік дырэктара і галоўны інжынер завода — шпіталізаваныя з траўмамі. Паводле некаторай інфармацыі, дырэктар завода набыў новы аўтамабіль літаральна за дзень да аварыі.

Алена КАЗЛОВА, Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА Ў СТУДЗЕНІ — $351,4

Рэальныя грашовыя даходы насельніцтва сёлета за студзень у параўнанні з адпаведным леташнім перыядам павялічыліся на 12,3 працэнта, паведамілі ў Міністэрстве эканомікі.

Спасылаючыся на звесткі Мінстата, у Мінэканомікі адзначаюць, што сярэднямесячная зарплата работнікаў у цэлым па рэспубліцы ў студзені склала 756,3 тысячы рублёў, ці 351,4 долара. У бюджэтнай сферы намінальная сярэднямесячная зарплата за студзень склала 634,3 тысячы рублёў ці 294,7 долара і павялічылася ў параўнанні з леташнім студзенем на 15,7 працэнта.

Ігар ГРЫШЫН.

АВАНС ЗА МЭБЛЮ — 6 МІЛЬЁНАЎ?

Махляр у Оршы падмануў мясцовую жыхарку: абяцаў зрабіць мэблю, дзеля чаго ўзяў у яе аванс у памеры каля 6 мільёнаў беларускіх рублёў. Зразумела, ніякай мэбляй ён на самай справе не займаўся.

Устаноўлена, што такім чынам вырашыў нядрэнна падзарабіць 22-гадовы беспрацоўны, які раней асуджаўся за крадзеж. Узбуджана крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Увага!

Працягваецца падпіска

на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі

на II квартал 2008 года

Нашы паслугі па падпісцы:

- падпіска на абанементную скрыню
- падпіска на дому
- дастаўка да кватэры з уручэннем «з рук у рукі»
- падпіска праз Інтэрнэт
- магчымасць аплаты пры дапамозе
- прасторавых картак
- прыём падпіскі па факсу для юрыдычных асоб

www.belpost.by

Падрабязную інфармацыю вы можаце атрымаць у любым аддзяленні паштовай сувязі ці па тэлефонах у г. Мінску:

222-72-17, 293-55-95, 227-20-31

Брэсцкі філіял (8-0162) 200-804
Віцебскі філіял (8-0212) 476-139
Гомельскі філіял (8-0232) 715-342
Гродзенскі філіял (8-0152) 757-159
Мінскі філіял (8-017) 222-75-65
Магілеўскі філіял (8-0222) 310-882

БЕЛПОШТА

У аварыі загінулі тры чалавекі

Учора каля 16 гадзін на аўтатрасе «Магілёў — Бабруйск» паміж Кіраўскам і вёскай Скачок сутыкнуліся аўтобус і маршрутка. «Неаплан» вёз групу дзяцей з Гомеля ў Санкт-Пецярбург на экскурсію: там было 49 чалавек, разам з вадзіцелем. Маршрутнае таксі «Магілёў — Бабруйск» было ўсё запоўненае, у мікрааўтобусе ехалі 13 чалавек. Як паведамілі ў Магілёўскім УУС, у выніку ўдару (сутыкненне было амаль лабавое) «Неаплан» заваліўся на бок, а рухавік з маршруткі адляцеў на 15 метраў.

У аўтобусе паранена адно дзіця, астатнія атрымалі сінякі ды драпіны. З пасажыраў маршрутнага таксі загінулі 3 чалавекі, 6 параненых. Папярэдне мяркуецца, што маршрутка выехала на сустрэчную паласу руху. Вельмі верагодна, што адной з прычын стала дрэннае надвор'е: у гэты час на Магілёўшчыне быў моцны снегапад.

Алена КАЗЛОВА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

З ПАЧАТКУ ВАЙНЫ Ў ІРАКУ ЗАГІНУЛІ 4 ТЫСЯЧЫ ВАЙСКОЎЦАЎ ЗША

З пачатку ваеннай кампаніі ў Іраку загінулі 4 тысячы амерыканскіх вайскоўцаў, паведамляе MSNBC, спасылаючыся на афіцыйную статыстыку, якая вядзецца Пентагонам.

Толькі з 19 сакавіка, калі споўнілася пяць гадоў з пачатку ваеннай кампаніі супраць рэжыму Садама Хусейна, у Іраку загінулі не менш за дзевяць вайскоўцаў. Апошнія па часе страты амерыканскі кантынгент панёс у нядзелю ўвечары, калі чацвёра вайскоўцаў былі забітыя ў выніку выбуху бомбы, што спрацавала на шляху патруля.

У Іраку, па стане на канец сакавіка 2008 года, нясуць службу каля 155 тысяч амерыканскіх вайскоўцаў.

У ЯПОНСКІМ ХРАМЕ З'ЯВІЎСЯ РЭЛІГІЙНЫ САБАКА

У адным з будысцкіх храмаў на поўдні Японіі стаў рэгулярна малюцца невялічкі сабачка, паведамляе AFP.

Паводле інфармацыі агенцтва, паўтарагадовы самец чыхуахуа па мянушцы Конан, які жыве пры храме, навучыўся садзіцца на задніе лапы, а пярэднія складаць перад сабой, пераймаючы паставу манахаў падчас малітвы. Сабачка пастаянна «моліцца» на адным месцы і вельмі злуецца, калі хтосьці яго займае.

НАВУКОЎЦЫ ВЫЯВІЛІ НА СПАДАРОЖНІКУ САТУРНА ПАДЗЕМНЫ АКІЯН З ЗАПАСАМІ ВАДЫ

Найбуйнейшы спадарожнік Сатурна Тытан мае падземны акіян, які складаецца з вады і аміяку.

Да такой высновы прыйшлі вучоныя, вывучыўшы інфармацыю аб кручэнні Тытана, сабраную міжпланетным зондам. Калі дзеная інфармацыя пацвердзіцца, гэта будзе азначаць, што на Тытане прысутнічаюць прыметы жыцця.



ЗА КАЗЛА АДКАЗАЛІ

У Бішкеку ў канцы мінулага тыдня праходзіў міжнародны турнір па кок-бору (кокпар — па-казахску), у якім прынялі ўдзел восем камандаў з Казахстана і Кіргізіі.

Кок-бору («казладранне»), гэты традыцыйны для качэўнікаў від спорту, забаронены ў савецкія часы, быў нядаўна адноўлены ў Кіргізіі. Барацьба дзвюх камандаў тут вядзецца за забітую авечку, якую пасля гульні ўжываюць у ежу. Гульня складаецца з трох 20-хвілінных перыядаў з 10-хвілінными перапынкамі. У аматараў з Кіргізіі ёсць мара, каб іх нацыянальны від спорту кок-бору стаў алімпійскім.

ЗША скарачаюць колькасць дыпламатаў

24 сакавіка ў Міністэрства замежных спраў Беларусі быў запрошаны Часовы Павераны ў справах Злучаных Штатаў Амерыкі ў Рэспубліцы Беларусь Джонатан Мур. Аб гэтым паведамілі ў знешнепалітычным ведамстве. У ходзе сустрэчы прадстаўнік ЗША паведаміў аб тым, што ў адпаведнасці з патрабаваннем беларускага боку аб выраўноўванні на парытэтнай аснове колькасці дыпламатычных прадстаўніцтваў Беларусі і ЗША на тэрыторыі адна адной адпаведная колькасць амерыканскіх дыпламатаў пакідае Рэспубліку Беларусь.

БЕЛТА.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08056

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.03.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 146,00
1 еўра	3 301,84
1 латвійскі лат	4 739,40
1 літоўскі літ	956,20
1 чэшская крона	129,67
1 польскі злоты	934,75
1 расійскі рубель	90,04
1 украінская грыўня	437,02

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	23,8351
10 UAH	47,1338
1000 BYR	11,0951
EUR	36,6632

Курс у гандлёвых кампаніях (на 24.03.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ЗНАК ЗВЕРА

У здраднікаў-злачынцаў няма нацыянальнасці

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 22 сакавіка).
Інтэрв'ю са старшынёй ваеннага трыбунала 1986 г. Віктарам ГЛАЗКОВЫМ

— Але, як гаворыцца, колькі вяровачцы ні віцца...

— Хатынь была на судовым працэсе толькі адным эпізодам, а ставілася ў віну здраднику Васюры шмат эпізодаў яго злачыннай дзейнасці, звязанай са знішчэннем жыхароў Беларусі.

...Хатынскай трагедыі папярэднічалі крывавыя падзеі на скрыжаванні шашы Плешчаніцы — Мінск, каля вёскі Казыры. Партызаны абстралялі нямецкую калону. Быў забіты ў перастрэлцы першы ротны камандзір 118-га батальёна гаўптман Ганс Вёльке, які ехаў у Берлін у водпуск. Гэта быў любімец Гітлера — ён першым з немцаў выйграў залаты медаль у штурханні ядра на Алімпійскіх гульнях 1936 года ў Мюнхене. Гэта пацвярджала тэзіс фюрэра аб выключнасці арыйскай расы...

Пасля абстрэлу калоны па трывозе быў узняты 118-ы паліцэйскі батальён. Каля вёскі Казыры расстралялі 26 лесарубаў, Васюра крычаў, каб ніводнага не засталося жывога.

Сведкам гэтага была Надзея Шалупіна, яна давала паказанні ў мяне на працэсе... Яна, дзяўчынка, пабегла да сваёй вёскі, а ёй наўздагон паляцелі кулі, чатыры з іх трапілі ў яе. Але Надзея выжыла...

Потым ужо карнікі накіраваліся ў Хатынь. Туды ж прыбыў і карны батальён «Чорная смерць», які цалкам складаўся з немцаў і здзейсніў на беларускай зямлі мноства крывавых злачынстваў. Немцы акружылі Хатынь і сачылі, каб ніхто з вяскоўцаў не мог уцячы. А расправу над хатынцамі праводзілі непасрэдна паліцаі пад кіраўніцтвам Васюры.

* * *

— Васюра адразу пагадзіўся з абвінавачаннем у страшных злачынствах?

— Не, напачатку ён усё катэгарычна адмаўляў: у Хатыні ён не быў, у гэты час знаходзіўся ў водпуску... Дзе якая карная аперацыя — ён там не быў: ці да цырульніка ў гэты час хадзіў, ці да палюбоўніцы...

Усяляк выкручваўся, каб эпізод у Хатыні яму не быў залічаны. Ён выбудоўваў сабе алібі — менавіта на хатынскі эпізод. Давялося нават праводзіць экспертызу. Васюра сцвярджаў, што быў у гэты час у водпуску ў Прыбалтыцы, у жонкі. Насамрэч у водпуску ён быў пазней, сведкі паказалі: менавіта Васюра ўзнімаў батальён па трывозе, калі абстралялі нямецкую калону, ён кіраваў знішчэннем Хатыні.

* * *

— Што за партызаны абстралялі нямецкую калону каля вёскі Казыры, з-за чаго так лютавалі фашысты?

— Так і не ўдалося высветліць, што гэта былі за партызаны, з якога атрада. Дакладна ўстаноўлена — што яны не з атрада Даўжонка, які дыслацыраваўся непадалёк ад Хатыні. Ні ў адной архіўнай крыніцы няма інфармацыі, хто ўзначальваў гэту групу, як яны выйшлі... У справе значыцца, што на сходзе гэты ўчынак партызан асудзілі: яны пакінулі без прыкрыцця вёскі. Згодна з паказаннямі, на дарозе дакладна праглядаліся сляды пяці чалавек.

...Прайшло шмат часу пасля судовага працэсу. Зусім выпадкова я даведаўся ад начальніка ідэалагічнага аддзела Глыбоцкага райвыканкама М. Чарапкоўскага, што адзін з партызанаў, які абстрэльваў нямецкую калону, жыве ў Германіі, у Дзюсельдорфе. У мінулым годзе я сустрэўся з гэтым чалавекам.

— Як бывае!..

— Колішні партызан атрада імя Суворава брыгады «Народныя мсціўцы» змяніў імя і прозвішча — цяпер ён Артур Леў.

— А што ж ён вам расказаў?

— Вельмі сцісла ён успомніў: напалі, абстралялі... Ніякіх падрабязнасцяў.

Як бачыце, не ўсе загадкі разгаданыя.

* * *

— Віктар Васільевіч, якім быў прысуд Ваеннага трыбунала 1986 года?

— Васюра быў прыгавораны да смяротнага пакарання — расстрэлу.

— А як ён успрыняў прыгавор да найвышэйшай меры пакарання?

— Спакойна. Па-мойму, іншага ён і не чакаў. Васюра абскардзіў прыгавор.

— Якая ягоная матывацыя?

— Ён не аспрэчваў ніводнага эпізоду. Усё, што яму інкрымінавалася па прыгавору — за ўсё, што ён тут вытвараў, — нічога не аспрэчваў. Прасіў замяніць смяротную кару пазбаўленнем волі. Пісаў, што ён гатовы выканаць любое заданне Радзімы і загладзіць сваю віну.

Касацыйная скарга была адхілена. Прысуд прыведзены ў выкананне.

* * *

Нямецка-фашысцкія акупанты разам са сваімі памагатымі здраднікамі-злачынцамі пакінулі на беларускай зямлі безліч сваіх д'ябальскіх крывавых знакаў.

Яны не маюць тэрміну даўнасці.

А з вышыні часу ці не самая галоўная адплата за іх злачынствы — праўда гісторыі. Без «купюр». І тым больш — без фальсіфікацый.

Таццяна ПАДАЛЯК.

Звеку словы у мову плылі,
Як крынічанькі ў светлую плынь —
Калі ў хатах шчасліва жылі,
То і вёска звалася Хатынь.

Ў кожнай хаце дзіцяткі раслі —
Тут заўжды шанавалі буслоў,
Ад Хатыні тры сцежкі вялі
Да суніц, да ракі, да грыбоў...

...так было, покуль доля была,
Але ў прысак зышоў родны кут,
Бо чацвёртая сцежка прайшла
Цераз пекла смяротных пакут.

Сёння тут не убачыць буслоў,
Не пачуць галасоў гаспадынь —
Немым ценем між сонечных слоў
Болем поўніцца слова ХАТЫНЬ.

Нашчадкі вогненных вёсак

«ІМ ЖЫЦЬ ТАК ХАЦЕЛАСЯ. ЖЫЦЬ БЫЛО ТРЭБА. УСЁ Ж АДЛЯЦЕЛА З ДЫМАМ ДА НЕБА...»

Мінута маўчання...

У суботу адбыўся мітынг-рэквіем, прысвечаны 65-й гадавіне трагедыі Хатыні.

...Жыхароў вёскі сагналі ў калгасны хлеў. Абклалі хлеў саломай, аблілі бензінам і падпалілі. Тых, хто вырываўся з полымя, бязлітасна расстрэльвалі з аўтаматаў і кулямётаў. 149 жыхароў вёскі, прыняўшы пакутніцкую смерць, згарэлі зажыва. 75 з іх — дзеці...

...Ім жыць так хацелася.
Жыць было трэба.
Усё ж адляцела
з дымам да неба.
І засталіся суровымі днямі
Назвы самотныя з камінамі.
Буры з дажджамі
жалобу там гралі —
І каміны, быццам свечкі пасталі.
Помніцца нам,
як жылі там багата,
Раненька ўсе прачыналіся хаты,
Рухаў да працы
люд іх насельны...
Звабліва ў печах
звонілі патэльні.
Жыццё пераходзіла
з бацькі да сына,
Лепей і лепей
з кожнай часінай.
Хлеб малаціли,
Дзяцей нараджалі,
Славячы долю, песні спявалі.

Ім жыць так хацелася.
Жыць было трэба.
Усё ж адляцела
з дымам да неба.
І замест вёскі —
шырокае поле...

Гэтыя радкі з верша Петруся Броўкі «Мёртвая вёска» ў выкананні народнай артысткі Беларусі Марыі Захарэвіч гучалі надзвычай праніслiва. Сотні людзей розных пакаленняў, што ўдзельнічалі ў мітынгу-рэквіеме, не стрымлівалі слёз. Такіх мёртвых вёсак на беларускай зямлі вайна пакінула сотні.

За тры гады акупацыі былі спалены 9200 вёсак, 5295 з якіх знішчаны разам з усім ці часткай насельніцтва. 628 вёсак падзялілі лёс Хатыні, з іх 186 так і не былі адноўлены...

«Людзі добрыя, помніце: мы

Сотні людзей розных пакаленняў прыехалі ў Хатынь.

Сведка хатынскай трагедыі Віктар Андрэевіч ЖАЛАБКОВІЧ.

любілі жыццё, і Радзіму нашу, і Вас, дарагія. Мы згарэлі жывымі ў агні. Наша просьба да ўсіх: хай жалоба і смутак абернуцца ў мужнасць і сілу, каб змаглі ўвекавечыць Вы мір і спакой на Зямлі. Каб нідзе і ніколі ў віхры пажараў жыццё не ўмірала!» — гэта словы сімвалічнага наказу мёртвых да жывых.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Генадзь Нявыглас адзначыў:

— Хатынь стала той незагойнай ранай, якая не дазваляе нашаму народу губляць гістарычную памяць... Велічны Хатынскі мемарыял — сімвал народнай памяці і болю, сімвал бессмяротнасці, пакланіцца якому прыходзяць мільёны людзей з усяго свету. Званы Хатыні аплакваюць таксама знішчаных мірных жыхароў іншых беларускіх вёсак, шматпакутных жыхароў блакаднага Ленінграда, сотні тысяч ахвяраў замучаных у Трасцянцы, Азарычах, Асвенціме, Бухенвальдзе, Майданаку і іншых канцлагерах, загінулых у ходзе масавых карных аперацый...

У гэты дзень ва ўсіх рэгіёнах Беларусі прайшла патрыятычная акцыя «Хатынь — усенародны боль і памяць». Удзельнікі акцыі аддалі даніну памяці герояў і пакутнікам мінулай вайны, усім ахвярам узброеных канфліктаў і тэрарыстычных актаў, якія адбываюцца і ў наш час. Акцыя заклікала ўсіх людзей добрай волі аб'яднаць намаганні супраць войнаў, міжнароднага тэрарызму, новых спроб сілавога вырашэння палітычных, эканамічных і нацыянальных канфліктаў.

Да Хатынскага мемарыяла ўскладзены вянкі ад Прэзідэнта Беларусі, міністэрстваў абароны і культуры, Мінаблвыканкама, афіцыйных дэлегацый мемарыялаў пацярпелых гарадоў і вёсак замежных дзяржаў.

У суботу адбыўся «круглы стол» на тэму «Хатынь: усенародны боль і памяць». У ім бралі ўдзел сведкі хатынскай трагедыі Віктар Жалабковіч, Уладзімір Яскевіч і Соф'я Яскевіч, прадстаўнікі мемарыялаў «Лідзіцэ» (Чэхія) Анчо Марынаў, «Пірчупіс» (Літва) Альвідас Валейша і Дайва Наркаускене, дырэктар музея Піскароўскіх могілак Санкт-Пецярбурга Алег Баеў, а таксама гісторыкі, архівісты, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, члены аўтарскага калектыву хатынскага комплексу Леанід Левін і Юрый Градаў.

Больш падрабязна аб гэтым «Звязда» раскажа ў адным з бліжэйшых нумароў.

Таццяна ПАДАЛЯК.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Генадзь НЯВЫГЛАС, міністр абароны Беларусі Леанід МАЛЬЦАЎ, старшыня Мінаблвыканкама Леанід КРУПЕЦ на мітынгу-рэквіеме.

Хакейная каманда Прэзідэнта Беларусі выйграла ў дружыны Віцебскай вобласці

Хакейная каманда Прэзідэнта Беларусі выйграла ў хакеістаў Віцебскай вобласці з лікам 6:2 у матчы Першых рэспубліканскіх спаборніцтваў сярод аматарскіх камандаў на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.

Гульня, што праходзіла 22 сакавіка ў сталічным Палацы спорту, для каманды кіраўніка дзяржавы была даволі няпростая. У першых двух перыядах яе ігракам удалося закінуць у вароты няўступчывых гасцей усяго дзве шайбы (вызначыліся Андрэй Кавалёў і Міхаіл Захараў). Толькі ў заключнай трэці матча гаспадары змаглі павялічыць сваю перавагу пасля дакладных кідкоў Паўла Белага, Мікалая Уладыкіна, Дзяніса Курдзекі і Уладзіміра Цыплакова. У складзе дружыны Віцебшчыны шайбы закінулі Васіль Гамзюк і Віталь Шакаў. Адзначым выдатную гульню галкіпераў абедзвюх камандаў Аляксандра Гаўрыленкі, які адбіў тры буліты, і яго віцебскага калегі Дзмітрыя Пашалюка, які не даў сапернікам рэалізаваць мноства небяспечных момантаў. Ён, дарэчы, быў прызнаны лепшым іграком у складзе гасцей, а ў пераможцаў лепшым быў названы Міхаіл Захараў. У гэтай гульні Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка шайбаў не закінуў, а ўсяго ў актыве на гэтым турніры 7 закінутых шайбаў і 8 рэзультатыўных перадач. Лідзіруе ў спрэчцы бамбардзіраў форвард прэзідэнцкай каманды Андрэй Асташэвіч — 11 шайбаў і 7 перадач. Цяпер у турніры лідзіруе каманда Прэзідэнта краіны, якая мае стопрацэнтны паказчык — 6 перамог у шасці праведзеных гульнях (12 ачкоў), на другім месцы спартсмены Міншчыны, у якіх 8 заліковых балаў.

У Беларусі будзе аказвацца дзяржпадтрымка прадпрыемствам, якія прыцягваюць знешнія дзяржаўныя пазыкі

Гэта прадугледжана Указам № 168 «Аб некаторых мерах па рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, што фінансуюцца за кошт знешніх дзяржаўных пазык (крэдытаў)», які 21 сакавіка падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Прадугледжваецца кампенсацыя з рэспубліканскага бюджэту 50 працэнтаў сумы працэнтных плацяжоў за карыстанне знешнімі пазыкамі, вызваленне ад плацяжоў за атрыманне гарантыі ўрада, абмежаванне камісійнага ўзнагароджання і маржы банкаў-агентаў, што абслугоўваюць знешнія пазыкі, вызваленне ад мытных плацяжоў і падатку на дабаўленую вартасць пры ўвозе тэхналагічнага абсталявання і запасных часткаў да яго, неабходных для выканання інвестыцыйных праектаў, спрашчэнне працэдур закупак тавараў (работ, паслуг)», — падкрэслілі ў прэс-службе Прэзідэнта.

Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена спартсменам, якія выступілі на IV Сусветных ваенна-спартыўных гульнях

За дасягненне высокіх спартыўных вынікаў на IV Сусветных ваенна-спартыўных гульнях у індыйскім горадзе Хайдарабад Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена работнікам Спартыўнага камітэта Узброеных Сілаў: старшыні Аляксею Мірашнічэнку і яго намесніку Алегу Шчурко, намесніку старшыні — начальніку 1-га аддзела Віталю Отчыку, галоўнаму трэнеру 2-га аддзела Спартаку Мірановічу, спартсменам-інструктарам Жанне Шапялевіч, Максіму Канафіну, Барысу Пухоўскаму і Іосіфу Чугашвілі. Адпаведнае распараджэнне Аляксандр Лукашэнка падпісаў 20 сакавіка. Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена намесніку старшыні Мінскага гарвыканкама Міхаілу Ціцянкову і намесніку міністра спорту і турызму Дзмітрыю Шычко за значны ўклад у падрыхтоўку і правядзенне на высокім арганізацыйным узроўні чацвёртага Калядnага міжнароднага турніру аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі.

На збор і перапрацоўку другаснай сыравіны ў Беларусі ў 2008 годзе будзе накіравана Br30 млрд

Прэзідэнт Беларусі вызначыў напрамкі і памеры выкарыстання ў 2008 годзе сродкаў дзяржаўнага мэтавага бюджэтнага фонду арганізацыі збору (нарыхтоўкі) і выкарыстання адходаў у якасці другаснай сыравіны. Адпаведны ўказ № 162 кіраўнік дзяржавы падпісаў 20 сакавіка.

Грошы будуць накіраваны на выкананне эксперыментальных, доследных і праектных работ, звязаных са зборам (нарыхтоўкай) і выкарыстаннем адходаў у якасці другаснай сыравіны, у тым ліку арганізацыю вытворчасці па перапрацоўцы палімерных адходаў і выпуску імпартазамяшчальнай прадукцыі. Частка сродкаў выдзяляецца на ўкараненне раздзельнага збору шклоадходаў, аснашчэнне арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць па абыходжанні з адходамі, кантэйнерамі для раздзельнага збору шклоадходаў, аўтамабілямі з маніпулятарамі для выканання пагрузачна-разгрузачных аперацый, іншым спецыяльным абсталяваннем. Арганізацыям Мінжылкамгаса, Белкаапсаюза, дзяржаўнага гандлёва-вытворчага аб'яднання «Белрэсурсы» і іншым арганізацыям будуць кампенсаваны затраты на правядзенне раздзельнага збору другаснай сыравіны.

Паводле паведамлення прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Бернд Штанге: «Адны мы не справімся!»

Паўабаронца Цімафей Калачоў з-за траўмы прапусціць таварыскі паядынак нацыянальнай футбольнай зборнай з камандай Турцыі, які адбудзецца 26 сакавіка на сталічным стадыёне «Дынама», аб чым паведаміў на прэс-канферэнцыі галоўны трэнер нацыянальнай дружыны Бернд Штанге.

Таксама траўмы маюць яшчэ некалькі ігракоў асноўнага складу — абаронцы Ягор Філіпенка і Павел Пласконны, паўабаронца Максім Рамашчанка і нападаючы Віталь Кутузаў. Аднак урачы зборнай пастараюцца зрабіць усё магчымае, каб хоць хтосьці з іх змог выйсці на поле ў матчы з туркамі. Нагадаем, што Сяргей Амельянчук і Аляксандр Кульчы, якія выступаюць за расійскі «Растоў», таксама не будуць удзельнічаць у паядынку — кіраўніцтва клуба прасіла не выклікаць футбалістаў у нацыянальную зборную па прычыне старту ў расійскім першынстве 27 сакавіка.

Нягледзячы на страты вядучых ігракоў, галоўны трэнер Бернд Штанге паабяцаў, што футбалісты праявяць характар і лепшыя якасці і запрасіў балельшчыкаў падтрымаць каманду. Настаўнік нацыянальнай дружыны нагадаў, што зборная Турцыі займае ў сусветным рэйтынгу 19-ю пазіцыю, у той час як беларуская каманда — на 61-й прыступцы. Да таго ж сезон у турэцкіх футбалістаў у самым разгары, а ў беларускіх ігракоў, якія пераважна выступаюць у расійскіх клубах, ён толькі-толькі стартаваў. Сапернік беларусаў адрозніваецца высокай тэхнічнасцю, да таго ж зборная Турцыі з'яўляецца бронзавым прызёрам 2002 года. Абыграць такую каманду вельмі няпроста, але прэстыжна, што і пастараюцца зрабіць ігракі нашай нацыянальнай каманды 26 сакавіка. Галоўны трэнер нашай зборнай Бернд Штанге запрасіў усіх аматараў футбола на стадыён «Дынама» — «адны мы не справімся», сказаў нямецкі спецыяліст.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

«Растаўсцеў» на малацэ

У дачыненні да 32-гадовага грамадзяніна Расіі супрацоўнікамі аддзела папярэдняга расследавання Мазырскага РАУС узбуджана крымінальная справа. Падазраецца гэты расіянін у махлярстве. У прыватнасці, як міркуецца, прайдзісвет змог летась у кастрычніку падманным шляхам завалодаць буйной партыяй вырабаў ААТ «Мазырскія малочныя прадукты». Паводле папярэдніх звестак, сума «прыхватызаванай» хітруном прадукцыі склала каля 78 мільёнаў рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

Грамадскія аб'яднанні: да колькасці — якасць

Колькасць грамадскіх аб'яднанняў у Беларусі стабільна расце. Паводле апошніх статыстычных даных, на бягучы момант іх зарэгістравана 2255 (235 міжнародных, 722 рэспубліканскія і 1298 мясцовых).

Паводле слоў намесніка начальніка ўпраўлення грамадскіх аб'яднанняў Міністэрства юстыцыі Алены Кірычэнкі, найбольшая колькасць вышэйпамянёных структур — фізкультурна-спартыўнай скіраванасці. Таксама ёсць дабрачынныя, асветніцкія, выхаваўчыя, маладзёжныя, інвалідаў вайны, навукова-тэхнічныя, нацыянальных меншасцяў, прыроды, культуры, жаночыя і іншыя.

Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў, напрыклад, ганарыцца тым, што спрыяла прыняццю на заканадаўчым узроўні пэўных мераў для паляпшэння жыллёвых умоў шматдзетных сем'яў. Беларускі саюз жанчын упэўнены, што не без яго дзейсных прапаноў у краіне пачалося павышэнне нараджальнасці. Кіраўніцтва Беларускага саюза журналістаў спрабуе «перамагчы» трывожную тэндэнцыю адсутнасці ў айчынных СМІ крытычных журналісцкіх выступленняў. Адным словам, можна сцвярджаць, што кожнае аб'яднанне актыўна «перамагае» намечаныя перад сабой задачы, аднак пры гэтым кожны пакуль «змагаецца» паасобку. На думку вярхоўнага атамана Беларускага казацтва Мікалая Улаховіча, у краіне наспела патрэба стварэння Грамадскай палаты, паколькі многія пытанні ў адзіночку не вырашаюцца. Скажам, у красавіку грамадскія аб'яднанні чакае павышэнне арэнднай платы за памяшканні, і той, хто ў адзіночку ўжо спрабаваў дабіцца льгот, пацярпеў няў-дачу.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Погляд

БНР: шлях з ценю

З нагоды 90-годдзя абвяшчэння БНР мы аналізуем значэнне гэтай падзеі ў гісторыі Беларусі, а дапамагае нам Міхаіл КАСЦЮК — акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН, які працуе ў аддзеле беларускай дзяржаўнасці.

Гісторыя БНР прайшла няпросты шлях ад неўспрыняцця і крытыкі. Доўгі час яна заставалася нібы за бортам — была ў ліку тых напрамкаў гісторыі, якія амаль не распрацоўваліся, больш за тое, па палітычных прычынах яна доўгі час знаходзілася ў цені БССР.

— У савецкай гістарычнай літаратуры дамінаваў тэзіс аб тым, што беларуская дзяржаўнасць бярэ пачатак ад утварэння БССР 1 студзеня 1919 года, — кажа Міхаіл Паўлавіч. — Гэта прыводзіць да аднабаковасці ў гістарычных даследаваннях.

Так працягвалася даволі доўга, пакуль не пачалася пэўная лібералізацыя ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х гадоў мінулага стагоддзя. Новыя гістарычныя абставіны далі навукоўцам магчымасць заняцца распрацоўкай тэмы БНР.

— Былі адкрыты некаторыя дакументы, звязаныя з дзейнасцю БНР, і пачалася даволі актыўная навуковая распрацоўка: рыхтаваліся артыкулы, абараняліся кандыдацкія дысертацыі, выходзілі зборнікі дакументаў. І хоць найбольш значныя з іх былі выдадзены за мяжой, тым не менш, беларускія навукоўцы істотна прасунуліся наперад у даследаванні гісторыі БНР за гэтыя амаль 20 гадоў. У калектыўных працах па гісторыі Беларусі, у прыватнасці, у другой частцы «Нарысаў гісторыі Беларусі» (1995 год) і ў пятым томе шасцітомнай «Гісторыі Беларусі» (2006), ёсць раздзелы, прысвечаныя гісторыі БНР. Такім чынам, гэта падзея заняла свае пазіцыі ў айчыннай гістарыяграфіі, і ігнараваць яе немагчыма.

Сёння гісторыкі не адмаўляюць гістарычнага значэння ўтварэння БССР, пры якой жыццё беларускага народа істотна змянялася да лепшага ў параўнанні з тым, як жылі ў Паўночна-Заходнім краі Расійскай імперыі — тады пра нацыянальнае самавызначэнне і гаварыць не выпадала. Аднак карані беларускай дзяржаўнасці значна больш глыбокія.

— Аб гэтым, прынамсі, згадваецца і ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года ды і ў далейшых яе рэдакцыях, — сцвярджае Міхаіл Паўлавіч. — У Прэамбуле Асноўнага Закона краіны сказана, што дзяржаўнасць на беларускіх землях мае шматвекавую гісторыю, і такая фармулёўка заканамерная. У адпаведнасці з ёю мы, навукоўцы, маем права распрацоўваць і гісторыю БНР, якая папярэднічала ўтварэнню БССР. Непасрэдныя перадумовы ўзнікнення БНР трэба шукаць у 1917 годзе, калі ў снежні адбыўся першы Усебеларускі з'езд. Ён быў разагнаны па той прычыне, што на ім выразна гучалі заклікі да самавызначэння беларускага народа на нацыянальна-дэмакратычнай аснове. Выбраны на першым з'ездзе савет змушаны быў працягваць працу ў падпольных умовах, дзейнасць яго ішла якраз у накірунку абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Калі 18—21 лютага 1918 года ў сувязі з наступленнем кайзераўскіх войскаў бальшавіцкія органы эвакуяваліся на ўсход, савет з'езда спрабаваў узяць уладу ў краі ў свае рукі. Аднак наступленне нямецкіх войскаў ішло вельмі інтэнсіўна, а часу пры гэтым было надзвычай мала — літаральна некалькі дзён, таму паспець зрабіць гэта яны не маглі. Аднак іх праца працягвалася і ва ўмовах акупацыі. Былі прыняты першая, другая, а затым і трэцяя Устаўныя граматы. Згодна з трэцяй, прынятай 25 сакавіка 1918 года, Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчалася незалежнай і вольнай дзяржавай.

Зразумела, ва ўмовах акупацыі дзеячам БНР не ўдалося забяспечыць усе неабходныя атрыбуты дзяржаўнасці, якія ў далейшым з'явіліся з утварэннем БССР, — дзяржаўныя межы, адладжаная сістэма ўнутранага кіравання і іншыя. У той жа час БНР можа пахваліцца істотнымі зрухамі ў іншых накірунках:

— Пэўнага ўзроўню дасягнула ажыццяўленне нацыянальна-культурнай палітыкі на беларускіх землях. Праз Украіну (дзе, прынамсі, функцыянавала Украінская Народная Рэспубліка, на вопыт якой і абапіраліся дзеячы БНР) праводзілі актыўную знешнюю палітыку — выходзілі на іншыя краіны, дзе маглі атрымаць прызнанне. Сувязі былі наладжаны ў той ці іншай ступені амаль з дзесяццю дзяржавамі.

Быў у дзеячаў БНР і сумны вопыт узаемадзеяння з нямецкімі ўладамі — знакамітая тэлеграма кайзеру Вільгельму, якая і мэтаў сваіх не дасягнула, і да расколу сярод саміх дзеячаў БНР прывяла. Тым не менш, акупацыйныя ўлады з дзеячамі БНР лічыліся, на радыкальныя крокі ў адносінах да іх яны так і не пайшлі. Дзейнасць БНР на Беларусі працягвалася да канца 1918 года, калі ў сувязі з лістападаўскай рэвалюцыяй у Германіі нямецкія войскі пакінулі беларускую тэрыторыю, а на іх месца заступілі фарміраванні Чырвонай Арміі.

— З гэтай нагоды дзеячы БНР вымушаны былі перамясціць сваю дзейнасць у эміграцыю — Коўна, Прагу, — расказвае Міхаіл Паўлавіч. — Гэта працягвалася да 1925 года, пакуль не было аб'яўлена аб самароспуску ўрада БНР. Сам факт абвяшчэння БНР — знакавая падзея ў беларускай гісторыі: па-першае, яна паскорыла працэс утварэння БССР, па-другое, яна мае трываласця сувязі з сучаснасцю. Сённяшняя суверэнная дзяржава — Рэспубліка Беларусь, сённяшняе нацыянальнае самавызначэнне яе жыхароў — менавіта тое, аб чым марылі, да чаго імкнуліся 90 гадоў таму дзеячы БНР. Нам варта захоўваць гэта ў памяці і цаніць.

Навукоўцам усё яшчэ ёсць над чым працаваць у гісторыі БНР: дагэтуль у краіне няма абагульняльных гістарычных прац па гэтай тэматыцы пры наяўнасці патрэбы ў іх. Так што будучыня ў гісторыі БНР таксама ёсць.

Ала МАЧАЛАВА.

Абзац

● Вадзіцель «Джыпа» на пешаходным пераходзе на вуліцы Кіжаватава ў Мінску збіла 10-гадовую дзяўчынку, якая з траўмамі дастаўлена ў бальніцу. ДАІ праводзіць расследаванне па факце.

● **Супрацоўнікі міліцыі ўзбудзілі крымінальную справу па падазрэнні ў спробе ажыццявіць крадзеж мазуту на трубаправодзе «Этанол» у Мазыры. Больш за 3 тоны мазуту выцекла на зямлю з адтуліны, якую зламысныя прасвідравалі ў трубаправодзе. Узбуджана крымінальная справа, ідзе пошук злачынцаў.**

● Чацвёра чалавек загінулі ў пажары ў вёсцы Плаўскія Слонімскага раёна. Пажар здарыўся каля гадзіны ночы 23 сакавіка. Як мяркуецца, яго прычынай стала ўзгаранне каструлі, пакінутай без нагляду на агні газавай пліты. Паколькі пажар быў заўважаны суседзямі вельмі позна і вёска знаходзілася за 20 км ад бліжэйшай пажарнай часці, людзей выратаваць не ўдалося. У агні загінулі дзве сям'і.

● **Грамадзянка Беларусі спрабавала завезці з Украіны ў Беларусь 1 кг 780 г марыхуаны. У пункце пропуску «Олтуш» памежнікі сумесна з супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з незаконным абарачэннем наркотыкаў па Брэсцкай вобласці падчас догляду аўтамашыны «Опель» выявілі 10 поліэтыленавых пакетаў з рэчывам расліннага паходжання. Экспертыза паказала, што рэчыва з'яўляецца марыхуанай.**

● Сітуацыю амаль па Чукоўскаму ў мінулую пятніцу прыйшлося вырашаць брэсцкім ратавальнікам, толькі замест бегемота з балота давялося цягнуць загразлую карову. З такой просьбай у службу МНС звярнуўся жыхар вёскі Ляхі Пружанскага раёна. Вечарам ён вёў сваю карову з пашы і, каб скараціць шлях, вырашыў перайсці ўброд праз меліярацыйны канал. Сам мужчына пераадолеў водную перашкоду без цяжкасцяў. Складаней было з яго карміцелькай, якая па броха правалілася ў іл і загразла ў ім настолькі, што не магла ссунуцца з месца. Экіпаж выратавальнікаў, які прыбыў на месца здарэння, выслабаніў карову з палону.

● **Міні-кекс «Казачны» вытворчасці Раменскага кандытарскага камбіната (Расія) апынуўся для жыхаркі Кобрына і яе сына-студэнта далёка не казачным страхам за сваё здароўе. У адным з шасці смешчаных ва ўпакоўцы кексаў жанчына разам з варанай згушчонкай выявіла шарыкі ртуці. Маці і сын адразу жа прайшлі абследаванне ў раённай бальніцы. Цяпер яны пачуваюцца здавальняюча. Іх засцерагло тое, што кекс ніхто з іх не праглынуў. Пры праверцы аказалася, што ўтрымманне гэтага небяспечнага рэчыва ў кексе перавысіла дапушчальны ўзровень у 800 разоў. Да разгляду гэтага выпадку прыступілі санітарная служба і МНС.**

● У нядзелю падчас карыды ў Іспаніі пацярпелі два матадоры. У Мадрыдзе падчас бою першы ж бык літаральна насадзіў на рогі вядомага тарэадора Хуліа Апарысіо. Вынікам стала рана на левым сцягне глыбінёй 25 сантыметраў. 39-гадовага Апарысіо прааперыравалі прама на месцы пад агульным наркозам. Са слоў урача, паранены яшчэ некалькі дзён будзе знаходзіцца ў бальніцы, пасля чаго адправіцца дадому на доўгую рэабілітацыю. Тарэадору Хасэ Томасу ў горадзе Малага пашанцавала больш. 32-гадовы тарэра атрымаў ад быка ўдар, але не рогам, таму пашкоджана была «толькі» левая нага. Пасля аказання першай дапамогі ён зноў узыўся за шпагу і перамножна давёў бой да канца.

● **На мінулым тыдні звычайны банкамат, які стаіць на вуліцы побач з супермаркетам у невялікім горадзе Хал на поўначы Англіі, стаў выдаваць роўна ў два разы больш грошай, чым запытвалі карыстальнікі. Хто запытваў суму ў 300 фунтаў стэрлінгаў, атрымліваў 600, а на чэку была ўсё тая жа сума ў 300 фунтаў. «Дабрачыннасць» машыны працягвалася некалькі гадзін, на працягу якіх да банкамата памкнуліся сотні ахвотнікаў скарыстацца незвычайнай памылкай. Праз некалькі гадзін у машыне, да вялізнага шкадавання гараджан, скончыліся ўсе грашовыя запасы. Кампанія, якой належаць банкаматы, да якіх-небудзь каментарыяў адмовілася. Усе, хто паспеў узбагаціцца за кошт гэтай выпадковасці, могуць быць аштрафаваныя, але толькі ў тым выпадку, калі кампанія падасць на іх скаргу.**

Поўны абзац

● Паход з жонкай у кінатэатр на прагляд фільма пра каханне закончыўся для новазеландца глыбокай ноччу гучным сямейным скандалам, у якім давялося паўдзельнічаць і паліцыі. Вечарам сямейная пара адправілася ў кінатэатр, але фільм здаўся галаве сямейства настолькі сумным, што ён заснуў. Яго жонка так разхвалявалася, што пакінула кіназалу і спячага мужа ў ёй. Раздражненне жанчыны змянілася трывогай, калі ў тры гадзіны ночы муж не прыйшоў дадому. Яна вярнулася і пазваніла мужу на мабільнік, ад чаго ён прачнуўся і паспрабаваў выйсці. Было цёмна, і ён незнарок актываваў ахоўную сігналізацыю. Паліцыя, якая прыехала па трывозе, была вымушаная мірыць раззлаваных сужэнцаў. Дарэчы, фільм, які яны глядзелі, называўся «P.S. Я кахаю цябе».

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармацыйных агенцтваў.

Экспрэс-аналіз

КОЛЕРЫ АВАРЫЙ

Часцей за ўсё ў ДТЗ летась траплялі сінія, чырвоныя і белыя аўтамабілі

Няшчасныя выпадкі на дарозе маюць цэлы шэраг заканамернасцяў. Апроч чалавечых памылак і тэхналагічных няспраўнасцяў, а таксама ўмоў надвор'я і стану дарожнага пакрыцця на бяспеку руху аказваюць уплыў, здавалася б, абсалютна пабочныя фактары рызыкі. Верагоднасць трапіць у дарожна-транспартнае здарэнне (ДТЗ) узрастае ў пэўныя дні тыдня і гадзіны сутак. А яшчэ, як высветлілася, існуюць найбольш аварыйныя колеры, маркі і мадэлі аўтамабіля.

Больш падрабязна прааналізаваць мінулагоднюю статыстыку аварыйнасці аглядальнік «Звязды» папрасіў начальніка ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС Аляксандра МЕНДЗЕЛЕВА.

— Аляксандр Міхайлавіч, разгледзім напачатку чалавечы фактар аварыйнасці. Ён, напэўна, асноўны?

— Так. Летась было зарэгістравана 7501 ДТЗ. Дык вось, 5680 аварый адбылося па віне вадзіцеляў, 1521 — па віне пешаходаў, 292 — па віне веласіпедыстаў і 20 — па віне асобаў, якія кіравалі гужавымі павозкамі. Хачу адзначыць, у параўнанні з 2006 годам усе без выключэння ўдзельнікі дарожнага руху паводзілі сябе больш дысцыплінавана.

— Статыстыка аварыйнасці пацвярджае распаўсюджанае сярод многіх мужчын меркаванне, што жанчына за рулём — малпа з гранатай?

— Наадварот, лічбы і факты пераканаўча абвяргаюць такую памылковую выснову. Летась па віне вадзіцеляў-жанчын адбылося 441 ДТЗ з 5680 аварый, учыненых кіроўцамі транспартных сродкаў. Так што больш небяспечныя і непрадказальныя за рулём якраз мужчыны, а не жанчыны.

— У якім узросце кіроўцы найчасцей трапляюць у ДТЗ?

— Летась найбольшая колькасць аварый здарылася па віне вадзіцеляў ва ўзросце ад 24 да 28 гадоў — 1132 ДТЗ, і ад 19 да 23 гадоў — 1100. Адзначу, што і пазалетась гэта былі самыя аварыйныя ўзроставыя групы.

Дарэчы, сярод жанчын-вадзіцеляў назіраецца такая ж заканамернасць. Больш за ўсё аварый на працягу апошніх двух гадоў учыняюць менавіта асобы ва ўзросце ад 24 да 28 гадоў. У 2006 і 2007 гадах на іх рахунку было адпаведна 91 і 103 ДТЗ.

— Ці маюць дарожна-транспартныя здарэнні сезонную заканамернасць?

— Калі зыходзіць са статыстыкі апошніх двух гадоў, то такой заканамернасці ўжо няма. Напрыклад, у мінулым годзе самым аварыйным быў ліпень: зафіксавана 743 ДТЗ. Цяжка дакладна сказаць, чым гэта было абумоўлена. Магчыма, свой негатыўны ўплыў аказала спёка.

Прасцей патлумачыць пазалеташняе сумнае «аварыйнае лідарства» снежня (987 ДТЗ). У гэтым месяцы традыцыйна складаныя для вадзіцеляў умовы надвор'я.

Летась найчасцей вінаўнікамі аварый былі вадзіцелі аўтамабіляў 1997 года выпуску.

— Якія дні тыдня і гадзіны сутак самыя небяспечныя для ўдзельнікаў дарожнага руху?

— Вось тут якраз нічога за апошнія два гады не змянілася. Найбольш ДТЗ па-ранейшаму адбываецца ў пятніцу, суботу і нядзелю. З той хіба толькі розніцай, што ў мінулым годзе рэкорд належаў пятніцы (1238 ДТЗ), а пазалетась — нядзелі (1425 ДТЗ).

Два гады запар пік дарожна-транспартных здарэнняў прыходзіцца

Затое сітуацыя на дарогах ў тыя ці іншыя часы сутак не змянілася. Два гады запар пік аварый прыходзіцца на 17 гадзін. Летась у гэты час здарылася 683 ДТЗ, у 2006 годзе — 730.

Абедзве заканамернасці тлумачацца вялікай інтэнсіўнасцю руху. Да таго ж у выхадныя дні з'яўляецца больш аматараў выпіць за рулём. Між іншым, традыцыйна найбольш ДТЗ нецвярозыя вадзіцелі здзяйсняюць менавіта ў выхадныя дні. Прычым, на працягу апошніх двух гадоў агульная колькасць такіх здарэнняў істотна не змянілася: у 2006 годзе было зафіксавана 867 такіх аварый, летась — 855.

У мінулым годзе найбольш ДТЗ (994) учынілі вадзіцелі сініх аўтамабіляў.

— Аляксандр Міхайлавіч, давайце разгледзім, так бы мовіць, тэхнічны фактар аварыйнасці. Якія маркі транспартных сродкаў найчасцей трапляюць у ДТЗ і чаму?

— Паводле вынікаў мінулага года «пяцёрка» лідараў выглядае наступным чынам. Вадзіцелі «Фольксвагенаў» учынілі 700 аварый, розных мадэляў ВАЗ — 528, «Аўдзі» — 461, «Форд» — 393, «Опель» — 306, «Мерседэс» — 238. Аналагічным быў «мадэльны рэйтынг аварыйнасці» і ў 2006 годзе. Тлумачыцца гэта ў асноўным тым, што машыны памянёных мадэляў самыя распаўсюджаныя ў Беларусі. Напрыклад, у прыватным карыстанні беларусаў знаходзяцца больш за 376 тысяч аўтамабіляў ВАЗ. Гэта рэкордны паказчык. На другім месцы па папулярнасці ў нашай краіне «Фольксваген» (амаль 276 тысяч), на трэцім — «Масквіч» (больш за 179 тысяч), на чацвёртым «Аўдзі» (больш за 152 тысячы), на пятым — «Форд» (амаль 144 тысячы), на шостым «Опель» (амаль 135 тысяч). Дзесятку лідараў замыкае «Мерседэс» — больш за 64 тысячы.

— Які год выпуску аўтамабіляў самы аварыйны?

— Летась найчасцей вінаўнікамі аварый былі вадзіцелі аўтамабіляў 1997 года выпуску. На іх рахунку 347 ДТЗ. У пазалеташні перыяд сумны рэкорд належаў кіроўцам транспартных сродкаў 1992 года выпуску — 401 аварыя. Так што, як бачна, дакладнай заканамернасці тут няма. Хоць, здавалася б, чым старэйшы аўтамабіль, тым ён больш небяспечны, паколькі тэхнічны стан ужо далёка не ідэальны. І, наадварот, новыя аўто павінны быць найменш аварыйныя. Аднак, насамрэч, па колькасці мінулагодніх аварый адназначна зрабіць такую выснову нельга. Увогуле, з-за тэхнічных няспраўнасцяў транспартных сродкаў летась адбылося 76 аварый, у 2006 годзе — 145.

— А колер аказвае негатыўны ўплыў на «схільнасць» аўтамабіля да ДТЗ?

— Паводле статыстыкі, у мінулым годзе найбольш аварый (994) учынілі вадзіцелі сініх аўтамабіляў. На другім месцы «чырвоныя» — 870 ДТЗ, на трэцім — «белыя» (830 ДТЗ). Гэтыя ж колеры былі ў тройцы лідараў і ў 2006 годзе. Праўда, пазалетась першынствавалі чырвоныя аўто.

Аднак, зноў жа, прамой залежнасці колеру і аварыйнасці няма. Я ўпэўнены, што прычыны трэба шукаць не ва ўзросце і не ў колеры аўтамабіляў, а ў іх гаспадарах, дакладней, многае залежыць ад культуры іх паводзінаў на дарозе.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

У КАТОЛІКАЎ — ВЯЛІКІ ДЗЕНЬ

Урачыстымі ранішнімі працэсіямі вакол храмаў пачаліся Велікодныя богаслужэнні ў мінскіх вернікаў рыма-каталіцкага веравызнання. Шматлюдныя калоны неслі парадныя харугвы, фігуры Хрыста і Маці Божай і вялікія велікодныя свечкі — Пасхалы. Напярэдадні вечарам адбыліся асабліва важныя віргілійныя набажэнствы і асвячэнне велікодных яек. «Хрыстос уваскрос» — аб'явіў на ўрачыстым набажэнстве ўсім католікам Беларусі арцыбіскуп Тадэуш Кандрусевіч мітрапаліт мінска-магілёўскі з галоўнай мінскай каталіцкай святыні — касцёла Найсвяцейшай Панны Марыі.

Фотаздымкі зроблены ў мінулыя суботу і нядзелю каля каталіцкіх храмаў у мікрараёне Серабранка, на плошчы Незалежнасці і на плошчы Свабоды.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Старажытныя сцены на фоне хай-тэк

На раскопках трэцяга палігона Бабруйскай крэпасці на дне рова знойдзена абарончая сцяна трохмятровай вышыні. Зроблена з чырвонай цэглы, на падмурку з валуноў, яна добра захавалася.

Гэтыя роў і сцяна, паводле ўспамінаў вайскоўцаў-адстаўнікоў, былі засыпаны ў 70-х гадах мінулага стагоддзя. Яны месціліся побач з Мінскімі варотамі Бабруйскай крэпасці, якія не захаваліся да нашых дзён: у зямлі былі знойдзены толькі гранітныя пліты, якімі былі абліцаваныя вароты. А вось галоўнае рэльефнае ўпрыгажэнне Мінскіх варотаў археолагі знайшлі, паведаміла супрацоўніца Бабруйскага краязнаўчага музея Іна Аўсейчык. Гэта вялізная (і вельмі цяжкая — падняць можна толькі ўдваіх) чыгунная выява герба Расійскай імперыі — двухгаловага арла. На жаль, захаваліся не ўсе фрагменты. Але можна зразумець, што размах крылаў гэтага арла быў не менеш за 1,5 метра. Старажытныя абарончыя збудаванні з чырвонай цэглы, якія адкапалі археолагі, дапоўніць будыніна ў стылі хай-тэк. Лядовы палац у Бабруйску, які ўзведзены ў форме вялікай лятаючай талеркі, плануецца адкрыць сёлетняй вясной, і для навядзення парадку на навакольнай тэрыторыі і праводзіліся раскопкі.

Ілона ІВАНОВА.

Тэлесеткі

ПА СЛЯДАХ МІЦКЕВІЧА

25—28 сакавіка на Першым канале Алег Лукашэвіч прадставіць новы цыкл дакументальных фільмаў свайго аўтарскага праекта «Эпоха». На гэты раз гаворка пойдзе пра класіка беларускай і польскай паэзіі Адама Міцкевіча.

Журналістам Белтэлерадыёкампаніі ўдалося сабраць невядомыя факты з жыцця заснавальніка школы рамантызму, а таксама ўнікальныя архіўныя дакументы. Здымкі цыкла праходзілі ў розных краінах, дзе паэт жыў і працаваў — у Беларусі, Літве, Расіі, Францыі, Турцыі. Гледачам таксама будуць прадстаўлены рэдкія старонкі з біяграфіі і творчасці Адама Міцкевіча, малавядомыя фотаздымкі.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

НАВУЧАННЕ Ў АЎТАШКОЛАХ ПАДАРАЖЭЕ

Максімальныя тарыфы за навучанне кіраванню механічным транспартным сродкам былі скасаваныя пастановай Савета Міністраў ад 19 сакавіка 2008 года № 425 у мэтах выканання Указа Прэзідэнта ад 28 лютага 2008 года № 131. А гэта значыць, што цяпер кожная аўташкола зможа самастойна вызначаць аплату за навучанне. Добра гэта ці не, а таксама колькі будзе каштаваць вывучыцца на вадзіцеля — пытанні далёка не шэкспіраўскія, і таму «Звязда» паспрабуе на іх адказаць.

«..Во, ізноў цэны выраслі. Зараз тыя правы ўжо і не атрымаеш», — скажа наш чытач, дый, бадай, я і згадзіўся б з ім, калі б не пабачыў працу сталічных аўташкол знутры падчас аперацыі «Вучэбны аўтамабіль», што праводзілася ў сталіцы падраздзяленнямі ДАІ на пачатку сакавіка. Бо з аднаго боку — сапраўды, пасля гэтай пастановы Сауміна за 599 080 рублёў + паліва на катэгорыю «В» вас ужо наўрад ці хто вучыць будзе, але з другога боку — з аўташкол нарэшце зняты ланцуг, які прымушаў іх працаваць на мяжы самаакупнасці. Такім чынам, скасаванне максімальна магчымага тарыфу за навучанне кіраванню павінна даць глыток паветра навучальным установам, якія цяпер знаходзяцца далёка не ў ідэальным стане. Здавалася б, усё проста і зразумела: пайшоў у аўташколу, запісаўся ў групу, заплаціў грошы, пакатаўся на вучэбнай машыне, здаў іспыты ў ДАІ — і атрымаў на здароўе сваё новенькае вадзіцельскае пасведчанне! Але паглядзіце статыстыку па здачы іспытаў, напрыклад, па горадзе Мінску за студзень-люты 2008 года — 66,1 працэнта кандыдатаў у вадзіцелі не змаглі атрымаць пасведчанне з першага разу! У чым прычына: у няздольнасці людзей альбо ў якасці навучання? Давайце разбяромся разам.

ПЫТАННЕ ПРАГРАМНАЕ

У рэспубліцы дзейнічаюць адзіныя праграмы па падрыхтоўцы вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў. І кожная аўташкола павінна вучыць людзей па гэтых праграмах, у якіх прапісана колькасць тэарэтычных і практычных гадзін навучання, тэмы, практыкаванні, абавязкі інструктара і шмат чаго іншага. Спецыялісты адзначаюць, што калі б гэтыя праграмы поўнасцю выконваліся, то такой вялікай колькасці пераздач не было б.

На пачатку сакавіка ў Мінску супрацоўнікамі ДАІ праводзіліся рэйды па кантролі за працэсам практычнага навучання кіраванню аўтамабілем. Вынікі: з праверэных 155 вучэбных машынаў у 89 выпадках (а гэта — 57,4 %) былі знойдзены парушэнні праграмных або іншых нарматыўных патрабаванняў. Прыязджаеш на аўтадром (аўтар на свае вочы бачыў), калі ўдзельнічаў у рэйдзе разам з інспектарамі ДПС ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Канстанцінам Нядбальскім ды Віктарам Пішчакам, а таксама з інжынерам-інспектарам МЭА ДАІ Мінгарвыканкама Аляксандрам Каменшчыкавым), а там курсанты катаюцца самі па сабе, а інструктары ходзяць недзе збоку, хоць праграма патрабуе ад іх сядзець поплеч.

Ці яшчэ выпадак. Спыняе інспектар у горадзе аўтамашыну з літарай «У» наверсе. Глядзіць дакументы, а там напісана — «кіраванне па загарадных дарогах». Узнікае пытанне:

— А што ж вы робіце ў горадзе, калі вам трэба за яго межамі ездзіць?

— Ну... За горад едзем! — радасна адказавае знаходлівы майстар.

— Хм.. Нешта доўга едзеце, бо па графіку вам ужо трэба хутка назад вяртацца, — не верыць інспектар ДАІ.

Дарэчы, на разглядзе ў Савеце Міністраў знаходзіцца праект змяненняў у праграмах навучання кіраванню. Плануецца адмяніць такі элемент, як «слізкая пляцоўка» і буксіраванне, а таксама некалькі тэарэтычных гадзін з вывучэння будовы аўтамабіля перанесці на вывучэнне бяспекі руху. Але гэта пакуль толькі планы.

ПЫТАННЕ ТЭХНІЧНАЕ І КАДРАВАЕ

Супрацоўнікі ДАІ з неспакоем адзначаюць нездавальняючы тэхнічны стан вучэбных аўтамабіляў. Справа ў тым, што вялікая частка з іх састарэла не толькі маральна, але і фізічна. Напрыклад, пры правядзенні тых жа самых рэйдаў было агледжана 292 аўтамабілі, і 90 з іх (30,5 %) эксплуатаваліся ў тэхнічна няспраўным стане. Людзі, калі прыходзяць у ДАІ здаваць іспыты, скардзяцца на тэхнічны стан аўтамабіляў, маўляў, як на такіх рарытэтах вучыцца? Дый што далёка хадзіць, мне сябра расказваў, як ён амаль што ўпісаўся ў тралейбус з-за няспраўнага руля ў вучэбнай машыне...

Транспартны сродак — гэта, безумоўна, важна. Але больш важна, хто ж на гэтай машыне будзе вучыць ездзіць. Не паверыце, але некаторыя інструктары маюць у сваіх вадзіцельскіх пасведчаннях адзнакі за перавышэнне хуткасці, за тое, што не прапускаюць пешаходаў, а то і зусім не маюць пасведчанняў! Так-так, я нічога не блытаю — такі сапраўды ўнікальны інструктар вучыў курсантаў сталічнай аўташколы ААТ «Аўтаправа», хоць быў пазбаўлены права кіравання транспартным сродкам ажно да 9 лістапада 2009 года за кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым стане. От і скажыце, што добрае, разумнае і вечнае можа пасеяць чалавек, які сам не паважае правілы дарожнага руху?

ПЫТАННЕ ХІТРЫКАЎ І ФІНАНСАЎ

Інспектар ДАІ спыняе вучэбную машыну. Звярае лічбы на спідометры і ў пуцявым лісце. Розніца — у 100 кіламетраў. Дзе наездзіў гэтыя лішнія кіламетры вадзіцель — невядома. Але гэта не самае вялікае разыходжанне лічбаў: былі зафіксаваныя выпадкі розніцы ў 981 і нават у 1070 кіламетраў! Зразумела, ад гэтай розніцы прыбытак ідзе ў кішэню інструктару.

Ёсць і іншыя дзівосы махлярства. Пакуль я нешта занатоўваў у свой штодзённік, чую, мяне кліча інспектар. Падыходжу. Ён мне паказвае вучэбную картачку курсанткі. «Глядзі, — кажа, — на фота!». Гляджу. Прыгожая дзяўчына, мо 19 гадоў. «А зараз глядзі, хто за рулём». Падымаю вочы. Ммммм... Як бы вам сказаць... Руль трымае жанчына, якой 19 споўнілася далёка не ўчора. Цікавімся ў інструктара, што да чаго. Высветлілася, што сапраўдная курсантка прыбегла, хуценька ў ведамасці распісалася дый пабегла па сваіх справах. «Ну а чаго час губляць дарма, — вырашыў інструктар ды пакатаў «легавага» чалавека. Вядома ж, не за прыгожыя вочы.

Чаму ж інструктары не баяцца згубіць працу і парушаюць правілы? Добрае пытанне. Адказ на яго знайшоўся, калі інспектары ДАІ праверялі чарговы вучэбны аўтамабіль.

— Што, пра парушэнні ў газету будзеце пісаць? — спытаў у мяне майстар, пакуль на яго пісалі службовы рапарт. — Лепей пра мой заробак напішыце, — пакапаўся ў бардачку машыны і падаў мне свой разліковы лісток. — Дару!

Паглядзеў я на гэту паперку і згадзіўся з ім, што пра лісток варта напісаць. Аляксандр Булойчык. Пасада: майстар кіравання. Студзень 2008 года. Тарыф — 2170 рублёў у гадзіну. Адпрацавана за месяц 166 гадзін. Налічана разам з прэміяй — 468 286 рублёў. Мінус падаткі — і на рукі нашаму Аляксандру належыць выдаць 330 907 рублёў... Ммммм... І як за такія грошы працюць? Сям'ю пракарміць? Вось ён, ключык да хітрыкаў інструктараў. Атрымліваючы такую зарплату, немагчыма не займацца «левакам», не эканоміць на курсантах час і паліва. Бо не ўкрадзеш — не пражывеш. Дый турбавацца за тое, што з працы выганяць, таксама не варта. Бо працаваць за такія грошы ахвотнікаў няма. Вось і пакутуюць аўташколы не тое што ад нястачы кваліфікаваных, а хоць бы і проста кадраў.

ВОСЬ ЯНО, УРАТАВАННЕ?

Адкуль такія праблемы ў сферы навучання кіраванню? Сярод спецыялістаў як саміх аўташкол, так і дзяржаўтаінспекцыі ды Міністэрства транспарту і камунікацый разыходжанняў у меркаваннях няма: асноўная прычына — фіксаваны тарыф, якога шматлікім навучальным арганізацыям не хапала нават для самаакупнасці (яны вымушаны былі зарабляць грошы іншымі шляхамі, напрыклад, на арэндзе). І вось нарэшце пастанова Саўміна, пра якую мы гутарылі ў пачатку, гэтую прычыну зняла. Цяпер аўташколы павінны будуць эканамічна абгрунтаваць тарыфы на свае паслугі ды зарэгістраваць іх або ў рэспубліканскіх органах дзяржаўнага кіравання, або ў аблвыканкамах ці Мінгарвыканкаме. Паводле прагнозаў, сярэдні кошт за навучанне складзе каля аднаго мільёна рублёў плюс паліва (тысяч 200). Вядома ж, дзе крыху меней, дзе крыху болей.

Пасля таго, як 28 лютага 2008 года Прэзідэнт падпісаў Указ № 131 і тым самым выключыў цэны на паслугі па навучанні кіраванню транспартнымі сродкамі з ліку тых, што рэгулююцца Саўмінам, спецыялісты Міністэрства транспарту і камунікацый запэўнівалі грамадскасць у тым, што пераразлік цэнаў не будзе для тых, хто паспеў запісацца на курсы ў аўташколы.

Аднак у пастанове Савета Міністраў ад 19 сакавіка 2008 года № 425 фраза «не распаўсюджваецца на дагаворы па аказанні паслуг па падрыхтоўцы вадзіцеляў, якія заключаны да яе (пастановы Сауміна. — **заўв. аўтара**) набыццця моцы» была выключана, таму аўташколы могуць правесці пераразлік па сваім жаданні. Але толькі на паслугі, якія аказваліся пасля 5 сакавіка 2008 года, калі быў апублікаваны Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 лютага 2008 года № 131.

Па ідэі, пасля атрымання фінансавай свабоды справы ў аўташкол павінны пайсці ўгару: будзе закупляцца новае абсталяванне, новыя аўтамашыны, дый зарплата ў майстроў павінна вырасці. А калі людзі будуць атрымліваць годны заробак, то і парушаць свае абавязкі пабаяцца, каб працоўнага месца не пазбавіцца. Новыя вучэбныя машыны, кваліфікаваныя інструктары, выкананне патрабаванняў праграмы — глядзіш і не будзе столькі пераздач на іспытах у дзяржаўтаінспекцыі. Але да таго, як мы зможам убачыць такі пазітыў, павінна прайсці не менш за паўгода, бо групы ў аўташколах па старых цэнах сфарміраваныя ажно да жніўня і пазней. Будзе такое ці не — пажывём, пабачым.

Павел БЕРАСНЕЎ.

КАРЫСНА ВЕДАЦЬ, ШТО ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ВАДЗІЦЕЛЯЎ КАТЭГОРЫІ «В»:

— выкладчыкі і майстры нясуць адказнасць за якасць навучання і падрыхтоўку навучэнцаў да здачы іспыту ў навучальнай арганізацыі і кваліфікацыйных іспытаў у ДАІ;

— падчас навучання кіраванню на дарогах агульнага карыстання кожны навучэнец павінен праехаць на вучэбным аўтамабілі не менш за 15 кіламетраў на працягу адной гадзіны;

— забаронена навучанне кіраванню на вучэбных аўтамабілях з аўтаматычнай каробкай пераключэння перадач;

— падчас правядзення заняткаў, тэматычнага кантролю і іспытаў майстар павінен знаходзіцца ў вучэбнай машыне на працоўным месцы, у тым ліку і пры правядзенні заняткаў на аўтадроме;

— на практычнае навучанне кіраванню аўтамабілем праграмай прадугледжана 40 гадзін;

— у склад камісіі пры прыёме выпускных экзаменаў у аўташколе павінна ўваходзіць не менш за тры чалавекі, уключаючы кіраўніка (ці яго намесніка) вучэбнай арганізацыі і інструктара;

— падчас здачы першага этапа практычнага іспыту ў аўташколе правяраецца: пераадоленне экстакады са спыненнем, заезд у бокс бокам і перадам ці задам, разварот на ўчастку абмежаванага памеру, рух па габарытнай «васьмёрцы», «танэлі» і «змейцы» , спыненне ў «стоп-лініі». На другім этапе ў навучэнца ацэньваюцца навыкі кіравання аўтамабілем ва ўмовах рэальнага дарожнага руху на маршруце даўжынёй не менш за 5 кіламетраў.

— кваліфікацыйны іспыт у ДАІ складаецца з тэарэтычнай і практычнай частак. Практычная частка прадугледжвае сабой бездакорнае пераадоленне эстакады і праезд не менш за 20 хвілін па вуліцах горада.

Простыя рэчы

Як любому журналісту, мне прыемна, калі публікацыі атрымліваюць водгук у чытачоў. Вось і нядаўна атрымаў ліст з Оршы ад В.Д. Кабачэўскага. Ён робіць невялікі дадатак да маіх «Круп». Працытую аўтара:

«Хачу падказаць вам пра важны прадукт ваеннага часу — талакно. Ён карыстаўся вялікім попытам у партызан. Я добра памятаю, як яго выраблялі для брата, які партызаніў у атрадзе А. Неўскага брыгады К. Заслонава. Тады амаль кожны з насельніцтва. А свой прысуд людзі выносілі крыкамі адабрэння. Ну, ці не той жа мітынг цяперашняга часу? Але мітынг, як бы мы цяпер сказалі, легітымны, яго рашэнні станавіліся законам.

А на веча ж збіраліся пад гукі вечавога звону. З даўняй гісторыі да нас коцяцца гукі таго ж Полацкага вечавога звону. З даўніх васьмідзесятых успамінаецца бачаная ў тэатры імя Якуба Коласа ў Віцебску п'еса Уладзіміра Караткевіча «Званы Віцебска». П'еса аб нецітаннасці, колькі азначэнняў.

Вось вам :

Званіць ва ўсе званы — пра нешта гучна паведамляць.

Малінавы звон — вельмі прыемны, мяккі па сваім тэмбры звон.

Званіць — проста разносіць чуткі і плёткі.

Глядзець са сваёй званіцы — мець сваё, прыватнае меркаванне.

Звонкагалосы — які мае своеасаблівы голас, безумоўна, не падобны на гук звана, але ў нечым раўназначны яму.

Звонкая манета — тое, што належыць да золата ці срэбра альбо раўназначнае яму.

Не буду ўпадаць у разважанні, але і ў картах, калі сярод чытачоў ёсць іх прыхільнікі, маюцца **звонкі** — масць, якая абазначаецца чырвонымі ромбікамі. Відаць, ад сваёй выяўнай звонкасці.

Ды і **звонкі звычны** — ён утвараецца з удзелам голасу.

А як думаеце, **званы госць** — паходжанне слова таксама ад звана, ад апавяшчэння пра тое, што ты пажаданы ў хаце чалавек?

Можна званіць і крыху інакш. Зноў жа звярнуся да «Новай зямлі» Якуба Коласа:

Дае дарэктару ён бляху. —
Звані ў яе, бі, чым попала,
Абы мацней яна гучала —
На ўсю Свярэнскую граду!

А ёсць яшчэ і **званец** — травяністая расліна сямейства залозніковых з жоўтымі кветкамі і пладамі ў выглядзе каробачкі. А ёсць і **званочкі**, таксама травяністая расліна сямейства званочкавых з блакітнымі альбо цёмна-сінімі кветкамі, падобнымі на званок. Вы іх можаце сустрэць у час сваіх вандровак на прыроду.

Але як тут абысціся без Максіма Багдановіча, які так мала пражыў, але так шмат зрабіў для нашай літаратуры і культуры ўвогуле:

Здароў, марозны звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы мяккі снег!

Званочак — малы звон, па-рускі колакольчык. Калі нашы папярэднікі перасоўваліся на конях, пад дугу абавязкова вешаліся званочкі. Наколькі помню з гістарычнай літаратуры, найбольш каштоўнымі і знанымі былі валдайскія, з Расіі.

Мяне разы са два папракнулі, што ў сваіх размовах пра простыя рэчы я звяртаюся і да рускіх крыніц. Папрок не прымаю, бо вельмі многае звязвае дзве нашых мовы, дзве культуры, дзве нацыі. Не будзем жа мы адмаўляць таго, што наша школа была і ёсць у многім школай рускамоўнай. Такія абставіны і жыццё. Дык вось, некалі, яшчэ салдацкам, я падрыхтаваў і здаў у выдавецтва рукапіс сваёй першай паэтычнай кніжкі. Рэдактар-рэцэнзент вельмі спрыяльна паставіў да першай яе часткі, дзе былі вершы вайскоўка плана. А на другой частцы проста напісаў: «Суцэльны Ясенін!» Так, захапляюся я гэтым паэтам у той час, вельмі паважаю яго і сёння. А таму на заканчэнне і ўспомнілася з Сяргея Ясеніна. Па тэме:

Колокольчик ли,
дальнее эхо ли —
Все спокойно впивает грудь.
Стой, душа, мы с тобой проехали
Через бурный положенный путь.

А вам, чытачы, далейшага шчаслівага шляху па гэтым жыцці і са святочным звонам.

Алесь КАСЦЕНЬ.
г. Паставы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗНІКЛА ЗОЛАТА

У ноч з 20 на 21 сакавіка з ювелірнай майстэрні ў Магілёве з металічнай скрыні для захавання золата, якая належала 32-гадоваму ювеліру, нехта скраў залатыя вырабы агульнай вагой 194 грамы на суму 8,7 млн рублёў. Як было скрадзена золата з апячатанай скрыні, якая знаходзілася ў пастаўленым на сігналізацыю памяшканні? Гэтую таямнічую гісторыю расследуюць супрацоўнікі Ленінскага РАУС горада Магілёва.

Алена КАЗЛОВА.

КУПІ ЛЕПШАЕ!

ТАВАРЫ ПАСЛУГ ЦЭНЫ

Выпуск № 6 (40)

З ВАДАЁМА Ў ВАДАЁМ

У найбуйнейшым рыбгасе Брэстчыны «Сялец» Бярозаўскага раёна атрыманы высокі ўраджай таварнай рыбы. Брыгадзе сартавальніц гэтага прадпрыемства (пераважную большасць тут складаюць жанчыны) даводзіцца адчуць сапраўдную вагу гадаванцаў сялецкіх вадаёмаў: карпа, таўсталобіка, амура, асятра, сома, сцерлядзі, ліня, шчупака. Тут сартуюць рыбу не толькі для спажывецкага прылаўка. Па відах, памеры і вазе рыба рассяляецца ў розныя вадаёмы і амаль усё «насельніцтва» вадаёмаў праходзіць праз рукі сялецкіх сартавальніц.

Адна з працаўніц сартавальнай базы — Алена ТРАШЧЭЙКА (на здымку).

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рэха публікацыі. З каментарыем

Дык кіёскам быць ці не?..

У нумары «Звязды» ад 5 лютага пад рубрыкай «На слыху» быў змешчаны даволі вялікі матэрыял «За кіёскі на гарадскіх прыпынках мінчане толькі падзякуюць». Па сутнасці ўвесь ён (разам з апытаннем на гэтую тэму гараджан) быў спробай пераканаць сталічныя ўлады, што камерцыйныя кіёскі, якія першыя паабяцалі да канца года прыбраць з прыпыначных пунктаў грамадскага транспарту, варта пакінуць на ранейшых месцах. І тлумачылася, што акрамя вонкавай прыгажосці ёсць куды больш важныя, прынамсі, для спажыўца, простага чалавека, рэчы, — найперш, зручнасць. Днямі мы атрымалі афіцыйнае рэагаванне з Мінгарвыканкама на тую публікацыю. Ці была рэдакцыя пачутай?

Ліст даволі змястоўны, месцамі — нават цікавы. Але... Па-першае, як нам падалося, у ім некалькі парушана логіка падачы фактаў — як быццам грувасткія фразы «выцягвалі» з розных дакументаў і так жа паслядоўна аб'ядноўвалі ў адзін новы. Спадзяёмся, мы толькі больш правільна перададзім сутнасць сустрэчных аргументаў гарадскіх уладаў, калі крыху падправім гэтыя хібы і крыху скароцім адказ. Гэтак жа думаем, што карыснымі будуць і нашы невялікія каментарыі.

Нам паведамляюць, што фарміраванне гандлёвай сеткі ў г. Мінску скіравана да таго, каб гандлёвыя арганізацыі горада мелі сучасны эстэтычны і тэхнічны ўзровень, аптымальны аб'ём таварных запасаў, высокую ступень таварнай насычанасці. «У развіцці гандлёвай сеткі прыярытэтная роля належыць буйным магазінам комплекснага попыту ў спалучэнні з сеткай спецыялізаваных магазінаў з паглыбленым асартыментам тавараў».

«У г. Мінску вядзецца актыўная работа па рэалізацыі неабходных пераўтварэнняў у сферы гандлю, стварэнні новых рабочых месцаў. Фарміруецца поўны комплекс паўсядзённых паслуг у мікрараёнах горада, ствараюцца ўмовы камфортнага пражывання мінчан з прыярытэтам новага будаўніцтва ў раёнах з найбольш высокім дэфіцытам гандлёвых плошчаў і ў зонах комплекснай забудовы тэрыторый».

Аўтар матэрыялу ў мінулы раз якраз і прыводзіў у якасці прыкладу свой новы мікрараён «Чырвоны Бор», дзе за апошнія тры гады пражывання адзіны новы магазін побач з домам з'явіўся ўсяго некалькі месяцаў таму. Астатнія — нешматлікія — размешчаны не вельмі зручна, адпаведна, камфортных умоў пражывання і поўнага комплексу паслуг мне забяспечыць пакуль не могуць.

Астатнія рэспандэнты падчас апытання, нагадаю, згадвалі пра немагчымасць прыпаркаваць аўтамабіль побач з буйнымі гандлёвымі цэнтрамі, чэргамі ўнутры, асабліва калі трэба было набыць некую дробязь. Выручалі якраз кіёскі на прыпыначных пунктах.

«У мэтах развіцця спажывецкага рынку, удасканальвання гандлёвага абслугоўвання і забеспячэння патрэб насельніцтва, у адпаведнасці з распараджэннем Мінскага гарвыканкама № 2611 ад 15.11.2007 г., распрацаваны і прыняты да выканання план развіцця аб'ектаў грамадскага харчавання на 2008—2010 гг., падрыхтаваны і знаходзіцца на ўзгадненні праект рашэння аб распрацоўцы схемы размяшчэння аб'ектаў гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання насельніцтва ў г. Мінску да 2015 года».

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Звернем увагу на дзве даты — «2008—2010 гг.» і «да 2015 года». Нагадаем, кіёскі пачалі зносіць з вуліц (ёсць пацвярджэнні гараджан) з пачатку гэтага года. А каб спачатку — пабудаваць хоць бы аб'екты, запланаваныя на ўвесь 2008 год, а ўжо потым, з пачатку наступнага года, прыбіраць кіёскі?! Бо неяк ужо нагадвае выключна адміністрацыйнае вырашэнне пытання... Вядома ж, мы зусім не бяромся сцвярджаць, што памянёная вышэй інфраструктура пачала развівацца толькі сёлета. Пацвярджэнне таму — далей у адказе з Мінгарвыканкама.

«Зараз у г. Мінску створана разгалінаваная інфраструктура спажывецкага рынку. Рознічная гандлёвая сетка прадстаўлена 2560 магазінамі, з іх: харчовых — 873, нехарчовых — 1582, змешаных — 105. Функцыянуюць 34 буйныя гандлёвыя цэнтры і 22 рынкі. За 2007 год адкрыта 75 гандлёвых аб'ектаў, з іх за кошт новага будаўніцтва — 27 магазінаў».

Прыстойныя лічбы, яны не могуць не радаваць. Як не можа не радаваць той факт, што апошнім часам у сталіцы ўсё больш уводзіцца ў эксплуатацыю жылля. За лічаныя месяцы на адносна невялікім кавалку зямлі з'яўляюцца некалькі новых дамоў-шматпавярховак. За год-два — фактычна новы мікрараён (прыгадваю найперш зноў жа свой і суседнія). Ці шмат у такім параўнанні памянёныя вышэй тры дзесяткі новых магазінаў? Зноў жа скажу і пра сябе і суседзяў — нас у многім выручаюць зараз кіёскі.

Калі гаварыць пра буйныя гандлёвыя цэнтры, рынкі, гараджаніну для паездак туды пажадана мець аўтамабіль і мінімум некалькі гадзін вольнага часу. Пасля працы ці ў выхадныя? Дык паўсюдна чэргі...

Далей нам паведамляюць, што кіёскі на тэрыторыі сталіцы, у тым ліку і ў складзе прыпыначных комплексаў, былі часова ўстаноўлены ва ўмовах фарміравання рынкавай эканомікі на пераходным этапе пры недастаткова развітай у горадзе гандлёвай сеткі і недастатковым асартыменце тавараў у магазінах. І далей па сутнасці цяперашніх прэтэнзій да іх. «Да асноўных недахопаў функцыянуючых кіёскаў можна аднесці адсутнасць неабходнага набору санітарна-бытавых, складскіх, падсобных памяшканняў, якія дазваляюць арганізаваць іх функцыянаванне без парушэння санітарных патрабаванняў як унутры аб'ектаў, так і на прылеглай тэрыторыі, а таксама стварэнне неспрыяльнай сітуацыі ў частцы забеспячэння бяспекі пасажыраў, што знаходзяцца на прыпынках грамадскага транспарту».

На наш погляд, парушэнне санітарных нормаў на прылеглых тэрыторыях і небяспека для пасажыраў — адносныя недахопы. І побач са стацыянарным магазінам нехта можа кінуць паперку ці іх падхопіць вецер. А патэнцыяльным пасажырам часам можа перашкаджаць і звычайны прыпыначны павільён-навес.

«Падчас ажыццяўлення дзяржнагляду за прадпрыемствамі дробнарознічнага гандлю сістэматычна выяўляюцца парушэнні санітарных патрабаванняў у частцы нездавальняючага санітарнага ўтрымання памяшканняў, перагружанасці кіёскаў прадукцыяй, складзіравання харчовых прадуктаў на падлозе навалам, перавышэнні ўзгодненага асартыментнага пераліку, складзіраванне смецця на прылеглай тэрыторыі, парушэнні тэмпературных умоў захоўвання і транспарціроўкі прадукцыі, незахаванне правілаў асабістай гігіены прадаўцамі, парушэнні таварнага суседства пры рэалізацыі харчовых прадуктаў і прамысловых тавараў.

За перыяд 2007 года санэпідслужбай было праведзена 513 праверак аб'ектаў дробнарознічнай сеткі, з іх на 257 прадпрыемствах былі выяўлены парушэнні санітарных правілаў і нормаў, на якіх накладзена 245 штрафаў на суму 42 529 000 рублёў. Прыпынялася эксплуатацыя 63 аб'ектаў. Забаронена да рэалізацыі прадукцыя негарантаванай якасці на 24 прадпрыемствах, агульнай вагой 404,6 кілаграма».

Гэта інфармацыя сапраўды сур'ёзная, яна заслугоўвае асаблівай увагі, паколькі гаворка ідзе як мінімум пра здароўе спажыўцоў. З іншага боку, і мы гэта бачым, санэпідслужба выканала сваю задачу: абараніла грамадзян ад нявякаснай прадукцыі. Пра што мы і пісалі ў мінулы раз, гаворачы аб неабходнасці жорсткага кантролю за працай кіёскаў. Але ж падобныя парушэнні (няхай і не ў такім вялікім пераліку) могуць быць выяўлены і ў іншых суб'ектаў гаспадарання, праўда?..

І, нарэшце, па-другое. З усяго афіцыйнага ліста так і не зразумела: пакінуць кіёскі на вуліцах горада ці працягнуць іх знос, як і запланавана? У рэагаванні мы знайшлі толькі агульныя фразы кшталту, што «работа па ўпарадкаванні функцыянуючых аб'ектаў дробнарознічнага гандлю ў складзе прыпыначных комплексаў працягваецца». Тым больш што нядаўна адна з газет дала невялікае паведамленне са спасылкай на прэс-службу Мінгарвыканкама, маўляў, знос кіёскаў прыпынены.

У пошуках дакладнага адказу патэлефанавалі **начальніку аддзела гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Аляксандру ЛУКАШЭВІЧУ**. Апошні быў вельмі асцярожным у выказваннях і заклікаў нас рабіць тое ж: «нельга так вось адназначна адказаць: прыпынены знос кіёскаў ці не». Паводле далейшых слоў Аляксандра Аляксеевіча, «гэта карпатлівая работа», і што «адносна рэалізацыям раёнаў пастаўлена задача: прымаць узважаныя рашэнні па кожным факце з улікам усіх фактараў». Рэагуючы на настойлівасць журналіста, Аляксандр Лукашэвіч заўважыў, што «дзе рамонт дарожнага пакрыцця, тратуараў, вуліцы — там будуць вырашацца і пытанні навесаў». Напрыканцы суразмоўца заўважыў, «што гэта пытанне не толькі да гандлёвага аддзела». Магчыма, яно і так. Але калі ж гараджане нарэшце пачуюць (дакладней, іх пачуюць) дакладную інфармацыю: дзе, колькі і на які час застануцца пакуль такія патрэбныя большасці мінчан кіёскі?..

Сяргей РАСОЛЬКА.

Пытальнік

Калі бракуе агульнай культуры...

Неадноўчы даводзілася чуць выраз «спажывецкі экстрэмізм». Гэта нейкі афіцыйны тэрмін? Як да яго ставіцца?

І.І. БУРКОВА, *г. Мінск.*

Паводле слоў старшыні грамадскай арганізацыі «Мінскае таварыства спажыўцоў» Ірыны Астаф'евай, у айчыннym заканадаўстве такое паняцце і яго расшыфроўка адсутнічаюць. «Мне падаецца, што тут можна гаварыць пра агульную культуру паводзінаў асобных людзей, спажывецкую культуру, калі некаторыя грамадзяне неадэкватна разумеюць свае правы. Для іх існуе толькі іх уласны, як яны ўпэўнены, адзіна правільны пункт гледжання на некаторыя рэчы, якога такія людзі часам упарта прытрымліваюцца, нягледзячы ні на што іншае, у тым ліку і заканадаўчыя акты».

Пытальнік

Заказваючы вокны з ПВХ, можна патрабаваць ад устаноўшчыкаў і аддзелку адкосаў

Цяпер многія мяняюць вокны на пластыкавыя. Адны кажуць — добра, іншыя — не. Каторыя лепш? І яшчэ. Фірма ўстанавіла вокны (тое ж датычыцца і дзвярэй), а адкосы і ўсё астатняе трэба дарабляць самім. Альбо яны табе зробяць, але за дадатковую плату. Ці правамерна гэта?

Святлана ЯРМАЛЮК, *г. Брэст.*

Сапраўды, да нядаўняга часу (а, магчыма, і зараз па-ранейшаму) можна было назіраць наступнае пры заказе пластыкавых вокнаў. Адны фірмы браліся не толькі вырабіць і ўстанавіць заказчыку вокны з ПВХ, але і правесці аддзелачныя работы памянёных адкосаў, іншыя ж займаліся выключна вырабам і ўстаноўкай. На выкананне аддзелачных работ трэба было або шукаць іншых майстроў, або выконваць іх самому. «Не падабаецца? Шукайце іншую фірму, якая вам усё зробіць «пад ключ». І многія спажыўцы мусілі прытрымлівацца гэтай «парады». А як усё павінна быць насамрэч?

Аказваецца, як «Звяздзе» паведамілі ў навукова-праектным вытворчым РУП «Будтэхнорм», яшчэ 18 жніўня 2005 года загадам № 202 Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва быў прыняты дакумент пад назвай «Тэхнічныя коды ўстаноўленай практыкі». У ім ёсць і нормы, што датычацца запаўнення аконных і дзвярных праёмаў, утрымліваюцца правілы іх праектавання і ўладкавання.

У прыватнасці, у пункце 8.7 «Аддзелка адкосаў» (калі гаварыць пра воны) гаворыцца, што пасля запаўнення мантажных зазораў, уладкавання падваконных дошак і аконных зліваў необходна правесці аддзелку паверхні адкосаў і перамычак у адпаведнасці з вытворчай дакументацыяй (атынкаваць цэментна-пясчаным растворам, абліцаваць ліставымі аддзелачнымі матэрыяламі ці панэлямі). У якасці апошніх могуць выступаць панэлі ПВХ, гіпсакардон. Права выбару застаецца за спажыўцом. Зразумела, гэтыя матэрыялы (і работы) каштуюць грошай, таму не зусім зразумелае пытанне чытачкі наконт дадатковай аплаты. Пры заказе ўсяго комплексу паслуг аддзелачныя работы ўваходзяць па сваім кошце ў агульную суму дагавора (або не, калі вы адмаўляецеся ад іх). Вядома ж, пры яго заключэнні, уладкаванне адкосаў і кошт такіх работ павінны быць зафіксаваны пісьмова.

Як падкрэслілі спецыялісты навукова-праектнага вытворчага РУП «Будтэхнорм», спажыўцы маюць законнае права патрабаваць выкананне аддзелкі адкосаў у юрыдычных асобаў, індывідуальных прадпрымальнікаў, якія аказваюць па заказах фізічных асобаў паслугі па вырабе і ўстаноўцы вокнаў з ПВХ. Праўда, дададзім ужо ад рэдакцыі (і гэта могуць пацвердзіць спецыялісты, што працуюць у галіне абароны) гаворыцца, што пасля запаўнення мантажных зазораў, уладкавання падваконных дошак і аконных зліваў необходна правесці аддзелку паверхні адкосаў і перамычак у адпаведнасці з вытворчай дакументацыяй (атынкаваць цэмэнт

Інфарм-укол

«Дрэнныя» вугляводы — за лішнюю вагу

Вугляводы — аснова рацыянальнага харчавання, галоўная крыніца энергіі.

Калі з ежай у арганізм трапляе недастатковая колькасць бялкоў і тлушчаў, з вугляводаў могуць сінтэзавацца заменныя амінакіслоты і ліпіды. Усе вугляводы, якія трапілі ў арганізм, за выключэннем баластных рэчываў, перапрацоўваюцца ў глюкозу. У пячонцы, мышцах яны могуць назапашвацца ў выглядзе адкладанняў глікагену. Вугляводы здольны хутка пастаўляць энергію і расходавацца падчас адпаведнай патрэбы, галоўным чынам, падчас руху. Пры наступным прыёме ежы запасы глікагену зноў папаўняюцца. Праблема заключаецца ў тым, што калі ў арганізм трапляе больш вугляводаў, чым можа прыняць назапашвальнік, яны адразу ж перапрацоўваюцца для доўгатэрміновага захавання. Гэты шлях праходзяць усе напоі, прысмакі з утрыманнем цукру, прадукты з пшанічнай мукі. Яны прымушаюць падскокваць цукар у крыві, і ў выглядзе лішку адразу перапрацоўваюцца ў тлушч. Пік утрымання цукру ў крыві надыходзіць праз паўгадзіны пасля ўжывання нашча вугляводаў любога тыпу. У гэтай сувязі ўсе вугляводы дзеляцца на «дрэнныя» і «добрыя». «Дрэнныя» выклікаюць рэзкае павышэнне глюкозы ў крыві. Гэта ў першую чаргу белы цукар у чыстым выглядзе або ў спалучэнні з іншымі прадуктамі, напрыклад, пірожныя, цукеркі. А таксама хлеб з белай мукі, белы рыс, напоі, асабліва спіртныя, бульба і кукуруза. Яны адразу акумулююцца для доўгатэрміновага захоўвання і адкладваюцца ў выглядзе тлушчу. Асабліва гэта датычыць прысмакаў накшталт малочнага шакаладу або тартоў з вялікай колькасцю тлушчаў, якія таксама папаўняюць тлушчавыя запасы.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Твае правы

ЛІЧУ ДАХОД. ЯКІ ТУТ ПАДЫХОД?

Пры вызначэнні адраснай дапамогі прымаецца пад увагу кошт некаторых ільгот

Адрасная сацыяльная дапамога можа прадстаўляцца адзінокім грамадзянам ці сем'ям з даходам менш за «сярэдні» бюджэт пражыткавага мінімуму. Прычым БПМ пераразлічваецца штоквартальна і складае на сёння 200 080 рублёў. Гэта нібыта ўжо зразумела ўсім. Але разам з тым час ад часу тут узнікае цалкам лагічнае пытанне: а што, уласна кажучы, з'яўляецца непасрэдна даходам, якія выплаты бяруцца ці не бяруцца пад увагу падчас разліку адраснай падтрымкі? Такім чынам, у пошуках адказу мы вырашылі звярнуцца да галоўнага спецыяліста аддзела развіцця і каардынацыі сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяны Іванаўны КАСЦЮКОВІЧ.

Падворак — таксама прыбытак

Увогуле само права на адрасную падтрымку вызначаецца дастаткова проста — агульны даход сям'і дзеліцца на колькасць яе членаў. Пры гэтым пад сукупным даходам маюцца на ўвазе як грашовыя, так і неграшовыя паступленні.

Праўда, тут адразу трэба зрабіць дзве заўвагі. Даходы ўлічваюцца ў памеры да ўтрымання з іх падаткаў і іншых абавязковых плацяжоў. А сям'ёй лічацца грамадзяне, якія жывуць разам і вядуць агульную гаспадарку.

Падчас прызначэння адраснай сацыяльнай дапамогі ў склад сукупнага даходу ўключаюцца заробкі з улікам усіх прэмій, даплат і надбавак, даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці, узнагароджанні па дагаворах падраду, страхавыя выплаты па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворваннях, грашовая дапамога па месцы работы на харчаванне і праезд, дапамогі па беспрацоўі, аліменты, усе віды стыпендый і пенсій з улікам надбавак і павышэнняў, стыпендыі і матэрыяльныя дапамогі беспрацоўным, якія праходзяць прафесійнае навучанне ці перанавучанне, дзіцячыя дапамогі, дапамогі па часовай непрацаздольнасці, па доглядзе састарэлых ва ўзросце больш за 80 гадоў і інвалідаў I групы, грашовыя дапамогі дзяржаўных арганізацый і дабрачынных фондаў, грашовы эквівалент ільгот, дапамога на аздараўленне, бязнаяўныя жыллёвыя субсідыі, ранейшая адрасная сацыяльная дапамога, кошт бясплатнага харчавання на дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў і бясплатнага харчавання навучэнцаў ва ўстановах адукацыі, даходы ад продажу сельгаспрадукцыі, насення, кветак, мёду і іншай прадукцыі з асабістай гаспадаркі і даходы ад рэалізацыі прадуктаў промыславай дзейнасці (палявання, рыбалоўства, збору дзікарослых траў, ягад і грыбоў), даходы па акцыях, дывідэндах і долевых паях.

Малако як выключэнне

Так выглядае агульны пералік. Разам з тым у гэтым па-сапраўднаму вялікім спісе ёсць свае выключэнні. І тут варта спыніцца, прынамсі, на некаторых вельмі істотных момантах.

Вызначана, што ў склад сукупнага даходу не ўваходзяць паступленні ад здачы малака. Далей. Не бяруцца ў разлік аднаразовыя дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці і аднаразовыя дапамогі маці, якія сталі на ўлік у жаночай кансультацыі да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці. І, нарэшце, у сукупны даход не ўключаецца грашовы эквівалент некаторых ільгот — напрыклад, ільгот на лекі для дзяцей да 18 гадоў, на лекі, што прадастаўляюцца паводле спецыяльнага пераліку пры асобных захворваннях, па забеспячэнні тэхнічнымі сродкамі рэабілітацыі, ільгот на бясплатны праезд дзяцей да 7 гадоў, дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў з трэцяй і чацвёртай ступенямі страты здароўя, інвалідаў I групы, а таксама праезд грамадзян, якія суправаджаюць на лячэнне і аздараўленне інваліда I групы ці дзіця-інваліда да 18 гадоў.

— Пры гэтым таксама не прымаюцца пад увагу і некаторыя іншыя крыніцы сямейнага бюджэту, — кажа Таццяна Касцюковіч. — Так, з сукупнага даходу вырашана выключыць выплаты на падставе Закона «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», дзяржаўнае забеспячэнне і «кошт» гарантый дзецям-сіротам і дзецям, што засталіся без бацькоўскай апекі, аліменты, якія выплачвае грамадзянін ці сям'я, выплаты на кампенсацыю расходаў па дзяржаўным утрыманні дзяцей з няўдалых сем'яў, штомесячныя выплаты настаўнікам на літаратуру, грашовую кампенсацыю на блізнят, выдаткі на пагашэнне пазык, выдадзеных арганізацыямі на набыццё садовых домікаў і ўладкаванне хатніх гаспадарак, матэрыяльную дапамогу арганізацый работнікам-чаргавікам на будаўніцтва, сродкі, што накіроўваюцца жыхарамі малых гарадоў і вёсак на пагашэнне льготных жыллёвых крэдытаў, кошт прадукцыі з уласнага падворка, якая ідзе на асабістае спажыванне, кошт ільгот на праезд для адзінокіх інвалідаў II групы, якія маюць патрэбу ў пастаянным доглядзе, даходы асобаў, што адбываюць пакаранне ці знаходзяцца на прымусовым лячэнні, дапамогі на пахаванне, аднаразовыя дапамогі з прычыны стыхійных бедстваў, пажараў, крадзяжу маёмасці, смерці блізкіх людзей.

Варта зазначыць, што цяпер у склад сукупнага даходу не трапляюць і паступленні ад здачы ў арэнду зямельнага ўчастка, дома, кватэры, дачы ці гаража. Праўда, прычына тут вельмі простая — заканадаўства вызначае, што грамадзяне, якія здаюць нерухомасць, аўтаматычна пазбаўляюцца права на адрасную падтрымку.

Складзі. Потым падзяліць

Сплюсаваць усе «патрэбныя» даходы — справа нескладаная. Але тут варта ўзгадаць яшчэ некаторыя ўмовы, і ў прыватнасці, — сістэму каэфіцыентаў.

Па-першае, каэфіцыенты робяць спасылку на стан здароўя — у інвалідаў I і II груп, састарэлых ва ўзросце больш за 80 гадоў і асобаў без інваліднасці, але з медыцынскім заключэннем аб неабходнасці пастаяннага догляду агульны даход дзеліцца на 1,2.

А, па-другое, прадугледжаны каэфіцыенты ўліку эфекту ад сумеснага пражывання. Паколькі пры пражыванні ў адным доме вялікай колькасці членаў сям'і сума аплаты за электраэнергію, камунальныя і іншыя паслугі ў разліку на аднаго чалавека атрымліваецца меншай, тут вызначана наступная «раскладка». Агульны даход сям'і з 5 чалавек павінен дзяліцца на 0,875, з 6 чалавек — на 0,866, 7 чалавек — на 0,860, 8 чалавек — на 0,856, 9 чалавек — на 0,852, 10 чалавек — на 0,850, 11 чалавек — на 0,847, 12 чалавек — на 0,845, 13 чалавек — на 0,844, 14 чалавек — на 0,842, 15 чалавек — на 0,841.

Пры гэтым для сем'яў з дзецьмі-інвалідамі, інвалідамі I ці II груп, састарэлымі ва ўзросце 80 і больш гадоў, асобамі, якія не з'яўляюцца інвалідамі, але па заключэнні медыкаў маюць патрэбу ў пастаянным доглядзе, сістэма каэфіцыентаў выглядае крыху інакш. Сукупны даход такіх сем'яў з 2 чалавек дзеліцца на 1,05, з 3 чалавек — на 1,008, 4 чалавек — на 1, з 5 чалавек — на 0,975, 6 чалавек — на 0,966, 7 чалавек — на 0,961, 8 чалавек — на 0,956, 9 чалавек — на 0,953, 10 чалавек — на 0,950, 11 чалавек — на 0,948, 12 чалавек — на 0,946, 13 чалавек на 0,944, 14 чалавек — на 0,942.

Сяргей ГРЫБ.

Факт

Любіце дворніка

У цэнтры Гомеля, застыўшы ў бронзе, адставіўшы ў бок мятлу, стаіць маладая прыгожая жанчына і глядзіцца ў кішэннае люстэрка: у гаспадыні вуліцы — перапынак, хвіліна адпачынку. Такой жыхары горада на Сожы ўбачылі скульптурна-жанравую кампазіцыю «Дворнік», што адкрылася напярэдадні Дня работніка бытавога абслугоўвання насельніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Аўтарам яе з'яўляецца член Саюза мастакоў Беларусі Уладзімір Андрыянаў, а скульптуру адлілі ў адной з арганізацый Мінска.

Па выніках рэспубліканскага конкурсу па добраўпарадкаванні Гомель летась выйшаў пераможцам, і ў гэтым, сказаў старшыня гарвыканкама Аляксандр Бяляеў, вялікая заслуга дворнікаў, якія наводзяць чысціню на вуліцах, плошчах, дварах горада, ствараюць у ім утульнасць. І скульптурна-жанравая кампазіцыя «Дворнік» — гэта даніна павагі ім, іхняй гэтак патрэбнай рабоце. Любіце дворніка!

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Фота Мікалая БЯЛЬКОВІЧА.

ХАТНЯЯ ФЕРМА

Тэхнічнае пераўзбраенне хатніх гаспадарак заслужылі лепшыя малаказдатчыкі Мсціслаўшчыны. Мясцовы масласырзавод узнагародзіў даільнымі апаратамі вяскоўцаў, якія паводле вынікаў 2007 года, здалі, дзяржаве найбольш малака і паабяцалі не здаваць заваяваныя пазіцыі.

...Раіса Нікадзімаўна Васіленка з вёскі Забалацце праводзіць паказальную дойку. На падворку стаіць чорна-белая Зорка, адна з чатырох кароў гаспадыні. Тут жа выстаўлены новенькі даільны апарат, прадмет гордасці Раісы Нікадзімаўны і яе мужа Мікалая Уладзіміравіча Пруднікава.

— Добрая рэч, моцна палягчае працу вяскоўцу, — прыладжвае апарат і каментуе гаспадар. — Мы зараз падоім нашу Зорку за 7—8 хвілін, а рукамі давялося б даіць не менш за паўгадзіны.

Раней Мікалай Уладзіміравіч не меў дачынення да дойкі, якая традыцыйна лічыцца жаночай справай. Цяпер жа, калі з'явіўся ў гаспадарцы даільны апарат, спатрэбілася і дапамога мужчыны. Гаспадар хутчэй налаўчыўся спраўляцца з тэхнікай.

— Так, ужо і муж стаў даяром, — усміхаецца Раіса Нікадзімаўна. — Гэта які прагрэс! Раней адна дойка займала гадзіны паўтары. Ды і цяжка чатыры каровы падаіць тры разы на дзень. А цяпер дойка доўжыцца 25—30 хвілін, і пакуль муж доіць, я час не марную, а рабліо на гаспадарцы. Так што дзякуй за даільны апарат, гэта дапамога істотная.

Васіленка працуе загадчыцай фермы ў Забалацці, і міні-ферму стварыла дома. Яна летась прадала дзяржаве амаль 15 тон малака. Раіса Нікадзімаўна падлічыла, што яна з мужам зарабляе штодня на малацэ прыкладна 40 тысяч рублёў. Нядрэнны прыбытак для вясковай сям'і, тым больш што кошт малака цяпер павялічыўся.

— Частка грошай ідзе на гаспадарку, бо на чатырох кароў мы нарыхтоўваем 12 тон сена, — тлумачаць гаспадары. — Дапамагаем матэрыяльна дзецям і на сябе трацім. Зараз робім рамонт у хаце, будзе камфортна і прыгожа.

Сужэнцы прызнаюцца: хатняя гаспадарка вялікая — з каровамі яшчэ цяляты, свінні, індыкі, качкі ды куры, працаваць даводзіцца суткамі і на адпачынак застаецца мала часу. Аднак фінансава гэта сябе апраўдвае. З іх бяруць прыклад суседзі, аднавяскоўцы.

— На нашай вуліцы маюць кароў амаль усе, — гаворыць Раіса Нікадзімаўна. — Шмат у каго ёсць і дзве каровы. І маладыя трымаюць жывёлу з жаданнем, таму што сёння выгадна здаваць малако. Мы тут узрадавалі ся, калі закупачныя цэны на малако паднялі. Гэта добрая падмога.

— Калі вясковец не мае каровы — гэта толькі ад ляноты, — упэўнены Мікалай Уладзіміравіч. — Ну навошта працаваць? Прыйшоў, лёг, адпачыў. Карова — гэта клопаты, і не толькі ў нарыхтоўцы кармоў. Яна ўвагі патрабуе. Хоць і жывёліна, а яна кеміць, ёй догляд патрэбен і ласка. А без гэтай ласкі і кармоў яна малака не дасць.

Даільны апарат, які атрымалі сужэнцы, каштуе больш за 1,3 мільёна рублёў — так што наўрад ці яны самі прыдбалі б такое. Праўда, у нагрузку да дарагога падарунка ў вяскоўцаў запатрабавалі на працягу двух гадоў не зніжаць здачу малака. Але Раіса Нікадзімаўна і яе муж вырашылі ўзяць на сябе нават павышанае абавязацельства.

— Мы сёлета мяркуем прыдбаць яшчэ 2 каровы, бо на гэта даюць крэдыт, — расказвае Васіленка пра планы пашырэння вытворчасці малака на асобна ўзятым падворку. — І здаць за год 25 тон малака. Цяжка, безумоўна, будзе, але трэба жыць і зарабляць.

— Вясковец павінен працаваць, — падтрымлівае жонку Пруднікаў. — Калі ён не працуе, то гэта, так бы мовіць, недарэчнае жыццё нейкае. Нават не ведаю, як вам, гарадскім, гэта растлумачыць. Вяскоўца цягне да працы: пачынаеш з адной каровы, дзе адна — там другая, а потым трэцяя і чацвёртая...

У Забалацкім сельскім Савеце раскazваюць, што людзі даволі ахвотна здаюць малако. У адрозненне ад агульнай тэндэнцыі, у Забалацці пагалоўе жывёлы ў апошнія тры гады не скарачаецца.

— А сёлета яшчэ і павялічыцца статак, — прагназуе старшыня Савета Алена Патапенка. — Таму што многія паглядзелі на гэты даільны апарат і зрабілі высновы. Такі стымул, штуршок людзям патрэбен. І акрамя Васіленкі, іншыя вяскоўцы таксама гатовыя ўзяць больш кароў. Тым больш што цана прымальная. Грошы за малако плацяць спраўна кожныя два тыдні, ды за кожную тону малака і здадзенае цяля гаспадарка дае тону сена.

Сама старшыня таксама мае дзве каровы, і летась здала дзяржаве 1,7 тоны малака. Алена Патапенка не разумее, як можна ў вёсцы без каровы. Тым больш што гэта даступная ўсім крыніца дадатковага заробку.

Праўда, састарэлым жыхарам невялікіх вёсак выпадае з-за дрэннага здароўя адмаўляцца ад жывёлы. Аснoўнае прыватнае пагалоўе — на цэнтральнай сядзібе ў Забалацці: на 400 жыхароў — 70 кароў. Трымаюць кароў у асноўным людзі сяродняга і старэйшага ўзросту — тыя, каму за 40. Але і некаторыя маладыя сем'і, што засяліліся ў новыя домікі, мяркуюць браць рагуль.

Мсціслаўскі масласырзавод сёлета ўручыў пяць даільных апаратаў гаспадарам, якія здалі за год ад 11,5 да 20 тонны малака. Гэтыя выдаткі, лічаць на заводзе, не будуць дарэмнымі: убачаць аднавяскоўцы, што ад каровы можна атрымаць немалыя прыбыткі ды важкія падзякі, і з добрай зайздрасцю самі возьмуцца за справу, дапамогуць грамадству і заробяць сабе.

Ілона ІВАНОВА.

Мсціслаўскі раён.

УЗАРВАЎСЯ АЎТАМАБІЛЬ

У Бараўлянах у нядзелю а палове шостай вечара ў жылым прыватным доме прагучаў выбух: узарваўся аўтамабіль «Нива», абсталяваны для работы на звадкаваным газе.

Гаспадар самастойна рамантаваў газавае абсталяванне ў падвале дома, дзе знаходзіўся гараж. У выніку выбуху няшчасны загінуў на месцы здарэння. Акрамя таго, пацярпела жанчына, якая з апёкамі I і III ступені галавы, рук і ног змешчана ў бальніцу.

Ігар ГРЫШЫН.

Шлягеры і тыя, хто іх любіць

Шлягер — гэта такі музычны твор, які хочацца слухаць незалежна ад таго, прайшла мода на яго ці не. Шлягеры і запамінающа надоўга з-за таго, што яны вышэй за моду. Паразважаўшы так, Міхаіл Фінберг вырашыў зрабіць новую імпрэзу — цыкл канцэртаў, якія аб'яднаныя адной назвай, адной тэмай і адной мэтай: «Шлягеры на ўсе часы».

Час шлягераў у Беларусі і сустрэчы з імі ўжо вызначаны — канец сакавіка. Менавіта з 24 па 27 сакавіка Нацыянальны канцэртны аркестр паназваміць са сваім чарговым праектам, толькі цяпер ужо жыхароў сталіцы, што само па сабе падзея, бо бывае рэдка. Канцэрты адбудуцца ў вялікай зале Белдзяржфілармоніі, а весці іх будзе расійскі знаўца музыкі Святаслаў Бэлза. Яго роля — не толькі называць песні і выканаўца. Яму яшчэ давядзецца зрабіць свайго роду экскурс у недалёкае мінулае, каб лепш прадставіць не толькі час і ўмовы, у якіх нарадзілася тая ці іншая песня, але прыадчыніць таямніцы творчасці выдатных кампазітараў. Напрыклад, Мікаэла Таривердзіева — адзін з вечароў будзе прысвечаны яго памяці. Акрамя таго, будзе праграма з песень Аскара Фельцмана з удзелам самога кампазітара. Але яшчэ адна праграма мае назву «Джаз і класіка». А што — у гэтай музыцы таксама ёсць свае папулярныя творы, якія маюць вельмі шырокую вядомасць. Усё будуць выконваць «зоркі» — выключна салісты і музыканты аркестра. Зрэшты, шлягер — сам па сабе ўжо зорка, якая гадамі можа грэць сэрцы людзей. А нашы людзі адрозніваюцца асаблівай чуласцю і павагай да мінулага. Напэўна ж, прыйдуць, і будуць слухаць з замілаваннем і шэптам прамаўляць знаёмыя словы.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Экалогія

РАСПЛАТА ЗА АВАРЫЮ

Як паведамляла наша газета, у мінулым месяцы на трубаправодзе каля вёскі Засып Рэчыцкага раёна ў выніку аварыі было праліта 20 тон нафтапрадуктаў. У выніку гэтага было забруджана каля 2 тысяч квадратных метраў глебы і каля 30 тысяч квадратных метраў вадаёма.

«Захадтранснафтапрадукт», якому належыць трубаправод, павінен выплаціць беларускаму боку амаль 570 мільёнаў беларускіх рублёў за нанесены ўрон, падлічылі эколагі і накіравалі гэтай расійскай фірме рахунак на гэту суму.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Здымаецца кіно

ГЭТА ТРЭБА НЕ МЁРТВЫМ...

Саюзная дзяржава здыме ваенна-патрыятычную драму «Брэсцкая крэпасць»

«Лічу, што тэма гераізму абаронцаў Брэсцкай крэпасці актуальная і цяпер. Гатовы аказаць любую дапамогу ў здымках. Былы радавы 98-га супрацьтанкавага артылерыйскага дывізіёна, удзельнік абароны Брэсцкай крэпасці Пётр Бондараў». З гэтага ліста і слоў падзякі ад ветэрана старшыня Тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі Саюзнай дзяржавы Ігар Угольнікаў пачаў расказ пра маштабны праект, агульны для Беларусі і Расіі. Падрыхтоўчая работа над праектам — збор інфармацыі з розных архіваў, сустрэчы з ветэранамі і супрацоўнікамі музеяў, паездкі па месцах баявой славы — ідзе ўжо два гады, а рэалізацыя яго, дакладней, кастынг акцёраў, пачнецца літаральна днямі, з першых дзён красавіка.

Кадры з фільмаў «Бессмяротны гарнізон» і «Я — рускі салдат».

Зрэшты, перш чым распісваць перспектывы, трэба сказаць, што рэакцыя на праект з розных бакоў неадназначная. Як толькі пра гэту задуму стала вядома грамадскасці, у дырэкцыю ТРА пасыпаліся як падзякі і лісты з просьбамі «вазьміце мяне на здымкі хоць статыстам», так і пратэсты былых удзельнікаў вайны — маўляў, колькі можна скажаць гістарычную праўду на карысць відовішчных — і, адпаведна, прадаваемых — кінафільмаў. Аднак, паводле слоў дырэктара прадзюсарскага цэнтра кінастудыі «Беларусьфільм» Сяргея Маеўскага, задача якраз у тым, каб расказаць гэтую праўду: «Нават праз 60 гадоў успліваюць малавядомыя факты, зусім не такія, як нам выкладалі на ўроках гісторыі, таму наша мэта — паказаць гісторыю такой, якой яна была. Усё было крыху не так, як у падручніках, а ў некаторых момантах і зусім не так. У фільме не будзе звар'яцелых немцаў, ашалелых фашыстаў — будуць сур'ёзныя, разумныя і моцныя працаўнікі».

Яшчэ адна, ці не самая распаўсюджаная, прэтэнзія патэнцыяльнай аўдыторыі будучай карціны — уласна выбар тэмы: першыя дні вайны, Брэсцкая крэпасць... Здаецца, нам ужо расказалі пра гэта ўсё, што можна, і нават больш: некалькі месяцаў гераічнай абароны, байцы 33 нацыянальнасцяў, процістаянне 3 тысяч ацалелых абаронцаў і 18-тысячнай арміі вермахта. Але ў тым і справа, што толькі здаецца, быццам пра Брэсцкую крэпасць мы ведаем УСЁ. Кінакрытык, рэдактар часопіса «На экранах» Людміла Пергудава нагадала факты, аб якіх мала хто задумваўся, а многія і ўвогуле не ведалі. Так вось, за ўсю гісторыю савецкага кінематографа Брэсцкай крэпасці былі прысвечаны... 2 мастацкія фільмы. Толькі два (пры агульнай колькасці карцін аб Другой сусветнай вайне — больш як 100). «Бессмяротны гарнізон» 1956 года паводле сцэнарыя К. Сімонава і «Я — рускі салдат» 1995 года паводле аповесці Б. Васільева «У спісах не значыўся...». Так што для нацыянальнай кінастудыі запрашэнне быць сувытворцам і, адпаведна, саўладальнікам аўтарскіх правоў на фільм «Брэсцкая крэпасць» — вялікі гонар і шанц зноў нагадаць пра свой некалі выключна высокі ўзровень. З расійскага боку ўдзел у вытворчасці карціны возьме студыя, якая выйграе адкрыты конкурс — акрамя «Масфільма», ёсць яшчэ каля 7 прэтэндэнтаў.

Гламуру не будзе!

З бюджэту Саюзнай дзяржавы на вытворчасць фільма «Брэсцкая крэпасць» плануецца выдзеліць 225 мільёнаў расійскіх рублёў, а сам фільм у выніку будзе ўласнасцю Саюзнай дзяржавы. Зацверджаны ўжо генеральны прадзюсар карціны — Ігар Угольнікаў, і мастак-пастаноўшчык — Алім Мацвяйчук. Гэтаксама вядома, што ў фільме будзе гучаць музыка, можна сказаць, класіка сярод кінакампазітараў. Сяргея Пракоф'ева. Але ні з рэжысёрам, ні з акцёрамі пакуль што яснасці няма. І нават дата пачатку здымак — 22 чэрвеня 2008 года — можа быць зрушана. Вядома толькі фінішная «гадзіна Ч», устаноўленая Адміністрацыяй прэзідэнта Расійскай Федэрацыі: хоць кроў з носу, а карціна павінна быць у пракаце на момант святкавання 65-годдзя вялікай Перамогі — гэта значыць, да 9 мая 2010 года. Беларусь, праўда, зацікаўленая ў здачы фільма яшчэ раней, да 3 ліпеня 2009 года, калі будзе адзначацца 65-годдзе вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў... Аднак пакуль што яшчэ не гатовы канчатковы варыянт сцэнарыя, хоць сцэнарная група, складзеная з прафесіяналаў абедзвюх краін, рыхтуе ўжо 5-ю версію. Узначальваць гэты працэс Тэлерадыёвяшчальная арганізацыя Саюзнай дзяржавы запрасіла мэтра — драматурга Аляксея Дударава, які прызнаваны мастацкім кіраўніком пастаноўкі.

— Што вам расказаць пра акцёраў? Гламуру не будзе, не чакайце Анджаліны Джалі ці каго там яшчэ! — папярэдзіў Ігар Угольнікаў. — Мы не хочам ісці па шляху, калі «выцягнуць» карціну запрашаюць вядомых акцёраў. Паверце, калі мы здымалі фільм «У чэрвені 41-га», і на ролю беларускага пагранічніка прыглашалі Сяргея Бязрукава, то вельмі доўга спрачаліся наконт яго кандыдатуры. Добра, калі акцёр здольны выконваць зусім рознахарактарныя ролі, але ў фільме павінны быць нечаканасці, глядач у гэтым зацікаўлены, і нельга яго падманваць.

Зрэшты, пару імёнаў прадзюсар карціны ўсё ж назваў. Так, на не галоўную, але яркую ролю ваенурача ўжо запрошаны экс-дырэктар Купалаўскага тэатра Генадзь Давыдзька. Але Генадзю Браніслававічу красаваць у кадры давядзецца нядоўга: яго прататып, кінуўшыся абараняць хворых у шпіталі, загінуў падчас абароны Брэсцкай крэпасці адным з першых. Таксама прыглядаецца ў сюжэце роля для народнага артыста Расіі Мікалая Аляліна («Зваротнай дарогі няма», «Ішоў чацвёрты год вайны» і г.д.). Астатніх акцёраў плануецца падбіраць, выходзячы з гатовага сцэнарыя і бачання рэжысёра.

А на эканомленыя на Анджаліне Джалі грошы ўсё ж будзе запрошаны прадстаўнік амерыканскай кінаіндустрыі — рэжысёра з ЗША плануецца прывезці для здымак батальных сцэн. Гэты крок Ігар Угольнікаў тлумачыць проста: хочацца зрабіць кіно не толькі патрыятычнае, але яшчэ і якаснае, канкурэнтаздольнае на еўрапейскіх рынках. З гэтай жа мэтай выканаўчага прадзюсара карціны «выпішуць» з Германіі, дый на ролі немцаў плануецца запрасіць не прыбалтыйскіх акцёраў і не палякаў, як доўгі час было заведзена, а сапраўдных немцаў у сапраўднай нямецкай форме.

Ад Брэста да Калінінграда

Геаграфія здымак таксама інтэрнацыянальная: акрамя непасрэдна Брэсцкай крэпасці, частка кінагісторыі адбудзецца ў катакомбах Калінінграда. «Толькі там мне дазволілі некаторыя хады запаліць, а некаторыя — спаліць», — з радасцю, якую зразумеюць толькі кіношнікі, дзеліцца Угольнікаў. Ён увогуле вельмі адказна падыходзіць да рэалізацыі праекта, бо тут дзяржаўныя і творчыя інтарэсы накладваюцца на асабістыя ўспаміны:

— Мой дзед, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, памёр у 80-м годзе, а ягоны кіцель застаўся ў шафе. Цяпер я папаўнеў, і ён мне якраз падыходзіць. Так вось кожны раз на 9 мая я надзяваю кіцель — там ордэн Чырвонай Зоркі злева, і мне глыбока пляваць, калі ваенныя знаўцы сцвярджаюць, што вось да такога года яго насілі толькі справа, — саджуся за стол, выпіваю «наркамаўскія» 100 грамаў і ўзгадваю пра тых людзей, хто выйграў вайну, каму мы павінны быць удзячныя за гэту перамогу.

Адносна нядаўна Ігар Угольнікаў па-свойму ўшанаваў памяць дзеда, ваеннага лётчыка: дастаў з балота гэткі ж самалёт «МіГ-3», на якім лятаў дзядуля... і давёў яго да рабочага стану. Правёў у Новай Зеландыі лётныя выпрабаванні, і на 9 Мая гэты «МіГ» возьме ўдзел у парадзе ў Тушыне. Пакуль жа яго клопат — збіраць не столькі тэхніку (яе ў здымках будзе задзейнічана не вельмі многа, больш даводзіцца рабіць дэкарацыі і бутафорыі), колькі інфармацыю — з архіва ФСБ Расіі, музейных фондаў мемарыяла «Брэсцкая крэпасць-герой» і г.д. Ён урачыста абяцае журналістам, што не дасць нікому — перш за ўсё сабе — зняць дрэнны фільм. І гэтак жа ўрачыста, але без лішняга пафасу, абвяшчае, што сродкі ад рэалізацыі фільма павінны пайсці перш за ўсё на падтрымку самой Брэсцкай крэпасці. І ў гэта чамусьці верыцца.

А калі нехта сумняваецца, што карціна, зробленая пры ўдзеле «Беларусьфільма», зможа акупіцца ў пракаце — прапануем прыгадаць гісторыю з «Настассяй Слуцкай». На вытворчасць карціны, якую лічылася добрым тонам раскрытыкаваць у пух і прах, быў выдаткаваны 1 мільён доларaў. Толькі ў беларускім пракаце фільм сабраў 3 мільёны. А потым, пасля продажу расійскім пракатчыкам і дазволу перайменаваць у «Княгіню Слуцкую», ужо ў суседняй краіне фільм «пракаціўся», па розных звестках, на 6 або 7 мільёнаў долараў. Так што — немагчымага няма. Галоўнае, як заўважыў намеснік міністра інфармацыі Беларусі Аляксандр Слабадчук, каб у карціне «Брэсцкая крэпасць» не было нічога наноснага — «каб не атрымаўся другасны высокатэхналагічны баевічок».

Акрамя таго, хочацца спадзявацца, падчас ажыццяўлення гэтага саюзнага праекта расійскі і беларускі бакі вырашаць нарэшце яшчэ адну праблему — перадзел кінафонду яшчэ савецкіх часоў. Цяпер адны і тыя ж карціны захоўваюцца як на «Беларусьфільме», так і ў Дзяржтэлерадыёфондзе РФ, але ў нас яны чамусьці каштуюць для пракатчыкаў у 4 разы даражэй... Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя. Экранізацыі ж гісторыі нашай агульнай — гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці — чакаем з нецярпеннем. А ўсе папярэднія домыслы вакол карціны — гэта, напэўна, занадта раннія спробы падзяліць шкуру незабітага мядзведзя.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Фонд «Минскоблгосимущество»

«25» апреля 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, проводит открытый аукцион

по продаже объектов республиканской собственности, расположенных в д. Заручье Борисовского района Минской области, находящихся в хозяйственном ведении научно-производственного республиканского унитарного предприятия «Экран» (адрес продавца: г. Борисов Минской области, ул. Полка Нормандия-Неман, 167, тел. (0177)73 42 01)

На аукционные торги выставляются:

Сведения о капитальных строениях	Основные характеристики капитальных строений	Общая площадь, кв. м	Площадь земельного участка, отведенного для обслуживания капитальных строений, га	Срок аренды земельного участка, лет	Начальная цена продажи капитальных строений, руб.	Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка, руб.	Сумма задатка единого предмета аукциона, руб.
ЛОТ №1 Капитальное строение (инв. № 610/С-37918) Свинарник-маточник	Фундамент железобетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная, полы бетонные, водопровод — артскважина, канализации нет, введен в эксплуатацию в 1983 году.	903	2,8299	51	1 базовая величина, установленная на момент проведения аукциона	1 336 958	137 000
ЛОТ № 2 Капитальное строение (инв. № 610/С-37921) Пусковой комплекс подсобного хозяйства первой очереди	Здание одноэтажное. Фундамент железобетонный, стены кирпичные и панельные, перегородки кирпичные, крыша шиферная, перекрытия железобетонные, полы бетонные, инженерные коммуникации отсутствуют, введено в эксплуатацию в 1987 году.	1936	2,0211	51	1 базовая величина, установленная на момент проведения аукциона	954 970	98 000
ЛОТ № 3 Не завершенное строительством капитальное строение — здание коровника на 71 голову	Сроки освоения капитальных вложений 1984 год, строительство приостановлено в 1990 г. В последующие годы строительство объекта не велось.	1584	1,8150	51	1 базовая величина, установленная на момент проведения аукциона	856 254	89 000

Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания, составляют единый предмет аукциона.

Начальной ценой единого предмета аукциона (лота) является сумма начальной цены капитального строения и начальной цены права заключения договора аренды земельного участка.

Условия использования земельных участков: для размещения объектов сельскохозяйственного и деревообрабатывающего производства.

Условия участия в аукционных торгах: осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данных объектах; создание покупателем не менее 3-х дополнительных рабочих мест; при этом запрещается продажа покупателем, иное отчуждение объектов до выполнения им условий договора купли-продажи.

К участию в аукционных торгах допускаются негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом — доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем — нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский

Годовой баланс общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за 2007 год

220039 г. Минск, ул. Воронянского, 7а, 8 этаж, каб. № 35
тел./факс (017) 228 12 89, 228 12 91

(в тыс. бел. руб.)

АКТИВ	Код строки	На начало отчетного года	На конец отчетного года
1	2	3	4
Основные средства	110	59765,1	287188,3
Нематериальные активы	120	242,7	188,8
Запасы и затраты	210	8053,4	13265,7
Дебиторская задолженность	230	39,0	4449,3
Денежные средства	250	23287,6	51766,1
Финансовые вложения	260	70920,5	125996,8
БАЛАНС	**300**	**162308,3**	**482855,0**

ПАССИВ	Код строки	На начало отчетного года	На конец отчетного года
1	2	3	4
Уставный фонд	410	5480,0	5480,0
Добавочный фонд	430	58723,0	286860,1
Нераспределенная прибыль	450	87989,5	174262,7
Кредиторская задолженность	530	10115,8	16252,2
БАЛАНС		**162308,3**	**482855,0**

Отчет о прибылях и убытках общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за 2007 год

(в тыс. бел. руб.)

Наименование показателя	Код строки	2007 год	2006 год
1	2	3	4
I. Доходы и расходы по видам деятельности			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	615983,8	292191,1
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	18479,5	8765,7
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	020	597504,3	283425,4
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	270890,8	180249,6
Прибыль от реализации	**060**	**326613,5**	**103175,8**
II. Операционные доходы и расходы			
Операционные доходы	070	5568,0	8938,2
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	071		
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	080	5568,0	8938,2
в том числе: прочие операционные доходы	083	5568,0	8938,2
Операционные расходы	090	1042,7	1159,9
в том числе: прочие операционные расходы	093	1042,7	1159,9
Прибыль от операционных доходов и расходов	**120**	**4525,3**	**7778,3**
III. Внереализационные доходы и расходы			
Внереализационные доходы	130	0,0	1,7
Внереализационные расходы	150	1143,4	3979,3
в том числе: курсовые и суммовые разницы	152	20,6	0,0
прочие внереализационные расходы	154	1122,8	3979,3
Убыток от внереализационных доходов и расходов	**160**	**-1143,4**	**-3977,6**
ИТОГО прибыль за отчетный период	**200**	**329995,4**	**106976,5**
Налоги, сборы и платежи из прибыли	210	33482,1	25057,2
Прочие расходы и платежи из прибыли	220	122250,6	14500,5
Чистая прибыль (убыток)	**240**	**174262,7**	**67418,8**
Справочно (из строки 240): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль		122250,6	14500,5

Достоверность баланса и отчета о прибылях и убытках общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» подтверждена аудитором индивидуальным предпринимателем Ткач Светланой Ивановной (лицензия на осуществление аудиторской деятельности № 02200/0060292 от 03/02/2004 выдана Министерством финансов Республики Беларусь).

Аудиторское заключение аудитора индивидуального предпринимателя Ткач Светланы Ивановны по бухгалтерской (финансовой) отчетности:

«По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ООО Форвард-Брокер» достоверна, то есть подготовлена таким образом, чтобы обеспечить во всех существенных аспектах отражение активов и пассивов ООО «Форвард-Брокер» на 01 января 2008 года и финансовых результатов его деятельности за 2007 год».

УНП 806000181

РЭЧЫЦКАМУ АЛХІМІКУ НЕ ПАШАНЦАВАЛА

Аб гэтым нам паведаміў начальнік упраўлення па наркаканторлі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Гомельскага аблвыканкама Юрый Маркевіч. Той быў выведзены на чыстую ваду ў час праверкі медыцынскіх устаноў раёна з мэтай недапушчэння наркатычных і псіхатропных медпрэпаратаў з легальнага абароту ў нелегальны. Дык вось, у адной з аптэк горада быў выяўлены «ліпавы» рэцэпт на атрыманне тэафедрыну. Супрацоўнікі міліцыі ведалі, што гэты прэпарат пры злучэнні з іншымі можа быць выкарыстаны як кампанент для вырабу больш моцнага псіхатропнага рэчыва.

Гэта і пацвердзілася, калі быў затрыманы 43-гадовы жыхар горада, які па «ліпавых» рэцэптах і атрымліваў у аптэках тэафедрын, а таксама і іншыя медпрэпараты. Пры вобыску ў яго доме знайшлі абсталяванне, з дапамогай якога ён вырабляў псіхатропныя рэчывы, а таксама і 48,5 грама самых рэчывай. Падобнае гэтымі днямі мела месца і ў Светлагорску. Тут была затрымана маладая жанчына (дарэчы, раней судзімая), у якой было адабрана восем скруткаў і флакон з наркотыкамі — гераінам і яго растворам.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Ну, «Вова», пачакай,

або Аповед пра бывалага чалавека, які знішчыў шэсцьдзесят ваўкоў

Першыя трафеі

Адкуль у Яўгена Піліпавіча з'явілася цяга да паляванння, ён і цяпер, у шэсцьдзесят, сказаць не можа. Люблю і ўсё — такі яго адказ. З ранняга дзяцінства.

— Памятаю, у чацвёрты клас хадзіў, — расказваў ён мне. — Да абеду ішоў на паляванне, пасля яго — у школу. Так і праходзіў час. Весела і з карысцю для справы.

— А ці меўся які дазвол на паляванне такому малому? І хто даваў ружжо вам?

Аказваецца, дазвол Яўген атрымліваў у «самога сябе». І са згоды бацькі, які працаваў вартаўніком на ферме мясцовага калгаса, браў у рукі яго ружжо. Ні бацька, ні блізкія родзічы сям'і да паляўнічага занятку ніколі ніякай ахвоты не мелі, але адбіваць яе ў Яўгена і не спрабавалі.

Першым трафеем хлапчука быў добра ўкормлены заяц, якога ён падстрэліў на бураковым полі. Бацька ў той дзень для паляванння адпусціў яму толькі два патроны. І тут — такая ўдача. Яна так заахвоціла Яўгена, што ён ужо і не ўяўляў сябе без поля, лугавін, лесу. І без ружжа. А тут яшчэ і адзіны на ўсю вёску паляўнічы Мікалай Фешчанка, які без здабычы ніколі дадому не вяртаўся. Шанцавала яму кожны раз, і Яўген панадзіўся хадзіць разам з ім на паляванне, нават калі бацька абмяжоўваў яго з «пазыкай» ружжа па нейкіх прычынах.

Як бы там ні было, а пра справы непаўналетняга Яўгена Валяватага з вёскі Дворышча даведаліся ў Хойніках і, як ён сцвярджае, у руках аказаўся паляўнічы білет. Хлопцу тады было пятнаццаць гадоў. Крыху пазней, а можа і ў той самы час, ён купіў ружжо. І першым трафеем стала залаціста-пушыстая ліса. А потым — пайшло-паехала: усякая здабыча была.

У начных засадах

Мы гутарым з Яўгенам Піліпавічам у яго хаце вячэрнім часам. На сценах — адпаліраваныя ласіныя рогі, якія ён знаходзіў у лесе, на століку — розная літаратура і выразкі з газет на тэмы паляванна, а на падлозе — дзве воўчыя шкуры.

— Апошнія трафеі, — уключаецца ў размову жонка Яўгена Піліпавіча Марыя Васільеўна. — А дзе фота, дзе ты з жывым звяругам на пару? — пытаецца яна.

Гаспадар тут жа падае мне фотаздымак.

— Прыручаны? — пытаюся я.

— Ды не. Ваўчыца. З перабітым хрыбтом. Яна ледзьве не ўпілася зубамі ў маю руку. Гора было б. А так толькі рукаў бушлата пацярпеў.

Тут наша размова перапынілася, бо ў хату зайшоў сын Валяватых Ігар, які закончыў у Маскве сучасны гуманітарны інстытут і працуе ў Хойніцкім раёне егерам таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Другі сын, Уладзімір, служыць у пазаведамаснай ахове райаддзела ўнутраных спраў. Абодва — паляўнічыя. Ігар забіў двух ваўкоў, Уладзімір — аднаго. Бацькоўскае хобі, як відаць, і іх захапіла.

Звярнуліся да паляўнічых з такой прапановай: хто колькі заб'е драпежнікаў, столькі ў якасці прэміі цялят атрымае.

Гутарка пайшла ў новым рэчышчы: як пачыналася гадоў дзесяць, а то і болей таму, паляванне Яўгена Піліпавіча на шэрых разбойнікаў. Іх у гэтай мясцовасці пасля чарнобыльскай катастрофы развялося вельмі многа. Днём яны адлежваюцца ў адселенай зоне, дзе для звера вольніца, а па начах выходзяць з яе і нападаюць на жывёлу, якая знаходзіцца ў кашарах. Вось першага ваўка («Вову») Валяваты ўцэлілу якраз на калгаснай ферме.

Было, што адным стрэлам паляўнічы ўганяў карцеч у двух драпежнікаў. Яны ў кашары завалілі тады цялушку і пачалі грызці яе. Валяваты ў гэты час быў на сцірце саломы ў засадзе, і калі тыя апынуліся на адной лініі агню, націснуў на курок. То была, відаць, сямейная пара, прычым самец — вялікіх памераў, кілаграмаў восемдзесят, а можа і болей. Паляўнічы з вартаўніком фермы не без цяжкасці пагрузілі яго на калёсы. Каля дома Валяваты ваўчыца адышла ад стрэсу і ранення (хрыбет быў перабіты) і, знаходзячыся доўгі час у нерухомасці, раптам вышчарылася ды на руку сваімі вострымі зубамі. Менавіта ў той дзень і сфатаграфавалі паляўнічага і ваўчыцу, шкура якой і ляжыць на падлозе.

Вось яшчэ выпадак. Пасярод ночы вялізны ваўчара, нягледзячы на тое, што ферма асвятлялася электрычнымі лямпачкамі, пралез пад жэрдкамі і не стаў, як гаворыцца, разменьвацца на дробязі, выбраўшы самага рослага бычка. Кілаграмаў за 350 быў той, і воўк у спрытным скачку знізу ўчапіўся ў яго горла. Ды так і завіс: у бычка моц была. Ні з месца ні адзін, ні другі. Воўк чакаў, што яго зубы дакончаць справу, бычку чакаць нічога добрага не даводзілася, а Валяваты зверху, са сцірты, чакаў зручнага моманту, каб пры стрэле карцеч не трапіла ў бычка ці іншую жывёліну, што знаходзілася побач. І калі грымнуў стрэл, ваўку прыйшоў канец, а бычок, разы два перакуліўшыся, застаўся жывым-жывенькім.

— А аднойчы кіраўнікі мясцовай гаспадаркі «Судкова», — апавядае далей Яўген Піліпавіч, — звярнуліся да паляўнічых з такой прапановай: ад ваўкоў няма паратунку, каля трыццаці цялят загрызлі. Хто колькі заб'е драпежнікаў, столькі ў якасці прэміі жывёлін атрымае. Але паляўнічаму далёка не заўсёды ўсміхаецца ўдача. Так было і на той раз, таму стаўка павялічылася: паабяцалі за аднаго забітага дзвюх жывёлін. І вось на працягу некалькіх начэй я са сцірты пазбавіў жыцця пяцярых ваўкоў. А гэта азначала, што зарабіў дзесяць бычкоў ці цялушак. Ды толькі, напэўна, шкада было гаспадарцы аддаваць столькі мне, таму і параліся ў райцэнтры, што рабіць, бо слова ж трымаць трэба! А там — у адказ: а вы яму — па 25 кілаграмаў вагі каб кожная жывёліна была. І гэтаму, маўляў, рады будзе. Але я заўпарціўся: не вазьму. І да мяне болей не звяртайцеся. Дайце аднаго бычка кілаграмаў на чатырыста — і ўвесь разлік. Было гэта ў жніўні, а месяцаў праз пяць мне прапаноўваюць: бяры пяць бычкоў па шэсць пудоў кожны. Пагрузілі іх на транспарт і прывезлі да мяне дадому. Дык я вырасцію іх за зіму і вясну да 270 кілаграмаў кожнага і прадаў. Добрая выручка была.

У начных засадах не кожны паляўнічы мае ахвоту знаходзіцца. Асабліва калі ён адзін дзы яшчэ — упустую: сядзіш, цябе дождж, снег ці мароз даймае, а воўк недзе ў іншым месцы. Вынік — нулявы. Ці было такое ў Яўгена Валяватага? Яшчэ як, гаворыць ён. Уявіце, што ажно трыццаць дзве ночы запар не заплюшчыў ён вачэй і за суткі спаў толькі дзве-тры гадзіны (бо днём жа — пастаянная праца ў адной з сельгасарганізацый), а шэрыя — нібы скрозь зямлю праваліліся. Паляўнічы ж, добра вывучыўшы іхнія звычкі, быў упэўнены: прыйдуць, прыйдуць. Яны зараз кругі па раёне робяць, у іншых гаспадарках разбойнічаюць. Трэба чакаць. І дачакаўся: за тыдзень пяць ваўкоў забіў.

— Вось вы ў размове некалькі разоў сказалі, што палявалі са сціртаў. А каля жывёльных магільнікаў?

— І там засаду рабілі, і ў іншых месцах, дзе прынаду раскладвалі. Воўк вельмі хітры і асцярожны звер, адначасова агрэсіўны і, на маю думку, баязлівы. Вазьміце самую звычайную курыцу. Паспрабуй у яе забраць куранят, яна на цябе пачне налятаць. А калі тое ж самае пачнеш рабіць з ваўчанятамі ў адсутнасць іхняй маці, яна ніколі не прыйдзе да логава, а будзе наіраць здалёк, на бяспечнай адлегласці. Ваўкі тонка адчуваюць прысутнасць чалавека, калі ён робіць засаду ў траве ці пад кустом, а вось калі той знаходзіцца на вышцы ці на сцірце, дык не так. Акрамя таго, калі страляеш зверху і прамахваешся, дык карцеч ідзе ў зямлю і ты не баішся, што можаш трапіць у нейкую жывёліну, што знаходзіцца ў кашары.

— Бываюць промахі?

— Бываюць. Здараецца, што паранены звер сыходзіць. І тлумачыцца гэта тым, што ў цёмныя ночы (а ў мяне на ружжы прыцэл начнога бачання) ён дрэнна праглядваецца. І з-за гэтага сем ці восем ваўкоў, у якіх я страляў, збеглі, а двух параніў. Раніцай пайшоў па іхніх крывавых слядах. Адзін адкінуў лапы па дарозе, а другі дабраўся да запаведніка, куды паляўнічым ходу няма. Забарона.

Калі б не праблемы...

Тут ужо ў гутарку ўступіў егер і паляўнічы Ігар Валяваты, які да гэтага моўчкі слухаў расказ бацькі і згодна ківаў галавой: усё сапраўды так, маўляў. Як знаўца сваёй справы ён дапоўніў яго аповед...

За год адзін воўк можа з'есці да трох тон, а можа і больш, мяса. За суткі ён можа адолець да ста кілаграмаў. Ваўчыца пры добрым корме можа нарадзіць больш за дзесяць ваўчанят. А жывуць гэтыя драпежнікі, якія лічацца санітарамі лесу, 10—12 і больш гадоў. Яны ж — носьбіты ўзбуджальнікаў шаленства і гельмінтаў. Дык дзе той водападзел паміж карысцю і шкодай, якія прыносяць ваўкі чалавеку і прыродзе? Адказ у егера адзін: іх трэба знішчаць і знішчаць. А з гэтым, не ведаю як дзе, гаворыць Ігар Яўгенавіч, а ў Хойніцкім раёне работу неабходна актывізаваць. Чаму?

Ваўкі распладзіліся тут неймаверна, лічыць ён. Яны «пасвяць» цэлыя статкі дзікіх кабаноў у запаведніку, яны паядаюць там іншых звяроў і птушак, наносяць урон лясной гаспадарцы, яны робяць налёты на фермы. Іх выратоўвае Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік, дзе яны адчуваюць сябе беспакарана. Раней іх адстрэльвалі з верталёта, але некалькі гадоў такое там ужо не робіцца. Простаму паляўнічаму дарога туды закрытая.

Згодна з заканадаўствам, нельга застрэліць ваўка ці лісу, нават калі яны з прыметамі шаленства робяць «ваяжы» за дзвесце метраў ад населеных пунктаў. У адной вёсцы мужыкі гналіся за шалёнай лісой і папрасілі Валяватага прымяніць супраць яе ружжо, дык ён адмовіўся, ведаючы закон. Вось на суседняй ферме бегала ліса, і аналізы дзвюх кароў з прыметамі шаленства адправілі на даследаванне. А калі тое шаленства ды ў эпідэмію, крый Божа, перарасце, што тады?

За знішчанага ваўка паляўнічаму налічваецца прэмія ў памеры сямі базавых велічынь, а калі ён быў шалёны, то трыста тысяч. Меншыя памеры грашовых узнагароджанняў за ліс. Але паспрабуй атрымаць тыя тысячы. Вось канкрэтны прыклад, які назваў Ігар Валяваты. Некаторыя хойніцкія паляўнічыя не атрымалі тыя тысячы за забітых звяроў у 2006 годзе, што знайшло сваё пацвярджэнне і ў абласным аддзяленні таварыства паляўнічых і рыбаловаў, дзе сказалі, што тое ж самае і ў іншых раёнах.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАША ДАВЕДКА

У 2007 годзе на Гомельшчыне было знішчана 352 ваўкі. У тым ліку: у Нараўлянскім раёне — 37, Калінкавіцкім — 31, Ельскім — 24, Хойніцкім — 19, Лоеўскім — 16, Брагінскім і Гомельскім — па 15.

Летась у сельгаспадарках вобласці (даныя за 11 месяцаў) ваўкі зарэзалі, задушылі і з'елі 519 цялят і бычкоў. У тым ліку: у Хойніцкім — 90, Добрушскім — 84, Брагінскім — 82, Жлобінскім — 69, Лоеўскім — 63.

ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ КАЛЕДЖ МАСТАЦТВАЎ
інфармуе аб наборы навучэнцаў на 2008—2009 навучальны год

Дзённая форма навучання:

На аснове базавай школы

Спецыяльнасць «Мастацтва эстрады»

- слевы (кіраўнік, артыст эстраднага калектыву, выкладчык);
- інструментальная музыка — труба, саксафон, трамбон, гітара, ударныя інструменты (кіраўнік, артыст эстраднага калектыву, выкладчык).

Спецыяльнасць «Дызайн»

- «Дызайн» (дызайнер).

Спецыяльнасць «Харэаграфічнае мастацтва»

- народны танец (артыст, выкладчык).

Заўвага: у групы па спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва» прымаюцца і асобы, якія скончылі сярэднюю школу.

Спецыяльнасць «Народная творчасць»

- фальклор (арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці, кіраўнік фальклорнага калектыву);
- інструментальная музыка (кіраўнік інструментальнага калектыву, арганізатар культурна-забаўляльнай дзейнасці, акампаніятар).

На аснове сярэдняй школы

Спецыяльнасць «Народная творчасць»

- народныя абрады і святы (арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці «Рэжысёр народных абрадаў і святаў»);
- харавая музыка (арганізатар культурна-забаўляльнай дзейнасці, кіраўнік народнага хору).

Спецыяльнасць «Мастацтва эстрады»

- слевы (кіраўнік, артыст эстраднага калектыву, выкладчык);
- інструментальная музыка — труба, саксафон, трамбон, гітара, ударныя інструменты (кіраўнік, артыст эстраднага калектыву, выкладчык).

Завочная форма навучання на аснове сярэдняй школы

Спецыяльнасць «Народная творчасць»

- народныя абрады і святы (арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці «Рэжысёр народных абрадаў і святаў»).

Спецыяльнасць «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія»

- бібліятэказнаўства і бібліяграфія (бібліятэкар-бібліёграф).

Уступныя экзамены:

Па спецыяльнасцях «Харэаграфічнае мастацтва», «Мастацтва эстрады (слевы)», «Дызайн» абітурыенты здаюць: спецыяльнасць, беларускую (рускую) мову — ЦТ (на аснове агульнай сярэдняй адукацыі), дыктант (на аснове агульнай базавай адукацыі).

Па спецыяльнасцях «Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)», «Народная творчасць (інструментальная музыка)», «Народная творчасць (фальклор)», «Народная творчасць (харавая музыка)», «Народная творчасць (народныя абрады і святы)» па дзённай і завочнай форме навучання абітурыенты здаюць толькі экзамен па спецыяльнасці.

Па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» — залічэнне па конкурсу сярэдняга бала дакумента аб адукацыі.

АДРАС КАЛЕДЖА:

230015 г. Гродна, бульвар Ленінскага камсамола, 23.
Тэл.: (80152) 41 65 66, 41 28 28, 41 23 28, 41 74 21.

УНП 500024001.

Казкі для дарослых

ІНТЭРВ'Ю ПА АСАБІСТЫХ ПЫТАННЯХ

Прыгожым майскім днём я ішла па асвечанай сонцам гарадской вуліцы ў госці да вядомай пісьменніцы. Яна на той момант працавала ў незвычайным для сябе жанры — пісала кнігу пра каханне, а мне кардынальна ўзяць у яе з гэтай нагоды інтэрв'ю.

Сустрэліся, павіталіся, яна запрасіла на кухню — невялікую, але вельмі ўтульную, дзе ўжо быў накрыты столік на дваіх: кава, кексы, цукеркі... Хвілін дзесяць-пятнаццаць мы абмяркоўвалі «глабальныя» тэмы: надвор'е, цэны на рынку, мае высокія абцасы... Я ўжо нацэлілася ўключыць дыктафон і прыступіць да сваіх непасрэдных абавязкаў, але яна мяккім жэстам спыніла мой парыў:

— Я даю інтэрв'ю толькі з адной умовай... Спачатку вы самі раскажаце мне чыю-небудзь гісторыю кахання. Што-небудзь такое... на ваш погляд, незвычайнае. Згодны?

Куды было дзявацца? Я пагадзілася. І адразу ўспомніла пра Алу. Ці не. Я ўспомніла пра Алу, і толькі пасля гэтага пагадзілася.

***

...Некалькі месяцаў мы з Алай сядзелі ў адным кабінеце. Час ад часу я міжволі чула яе размовы па тэлефоне. Былы муж «абрываў» провад — прагнуў прымірэння. Яна не магла сказаць, што ненавідзела яго. Нянавісць — таксама вельмі моцнае пачуццё, а Валерык быў не варты такіх эмацыянальных узрушэнняў. Яна адкрыта здзекавалася з яго, зневажала, ігнаравала — карала за падман...

Калі яны толькі пажаніліся, малады муж паабяцаў: буду насіць на руках, забяспечу ўсім, аб чым папросіш. Ала ні аб чым не прасіла — ён сам прапанаваў, каб яна звольнілася з работы. Суменае жыццё здавалася прыемным і бязвоблачным. Паездкі з сябрамі за горад на шашлыкі, білеты на дарагія шоў і канцэрты, адпачынак за мяжой, асабісты цырульнік, асабістая масажыстка...

Казка скончылася праз некалькі месяцаў — раптоўна і нечакана. Аднойчы патэлефанавала жонка іх сябра і без доўгіх «прэлюдый» спытала, ці збіраецца Валерык разлічвацца з даўгамі. «Тры тысячы долараў», — данесласа з нетраў тэлефоннай трубкі, і Ала вырашыла, што гэта розыгрыш. «Валера добра зарабляе, навошта яму пазычаць грошы?» Прыяцелька не на жарт разлавалася: «Ды ты што, з месяца звалілася? Ён ужо паўгода нідзе не працуе, жыве ў доўг!»

Тады і адбыўся скандал, у выніку якога Валерык адправіўся «адбываць тэрмін» да бацькоў, а Ала засталася ў сваёй аднапакаёвай кватэры, падоранай бабуляй напярэдадні вяселля... Нехта з сяброў дапамог ёй уладкавацца на работу, дзе мы і пазнаёміліся. Розніца ва ўзросце ў нас была гадоў дзевяць-дзесяць, але гэта не стала перашкодай для зносінаў. Наадварот — яна не ўтойвала ад мяне нічога, адчуваючы маю яўную зацікаўленасць сваёй асобай. Я шчыра сімпатызавала ёй — яскравай, прыгожай, неардынарнай... Яе мама пры кожнай магчымасці чытала ёй натацыі. А я проста слухала і не навязвалася з парадамі. Часам яна сама пыталася, як лепш паступіць. Асабліва давяральныя нашы адносіны сталі пасля таго, як у яе жыцці з'явіўся Саша.

Іх знаёмства можна было назваць банальным. У начным клубе яна прыкмеціла высокага сімпатычнага бландзіна. А праз паўсе хвілін ён запрасіў яе на танец. Потым — яшчэ раз і яшчэ. А пасля павёз да сябе. І яна засталася ў яго на ноч, потым — на другую і на трэцюю... Атрымала ключы ад яго кватэры. «Калі ты захочаш збегчы, пакінь іх, калі ласка, каля тэлефона ў прыхожай, каб мне не трэба было да цябе заязджаць», — сказаў ён аднойчы. І ў тоне, якім гэта вымаўляў, не чулася ніякіх прымет шкадавання. Ён не трымаў яе. Не пытаўся, куды пойдзе і калі вернецца, не цікавіўся мінулым. На століку ў спальным пакоі стаяў фотаздымак яго былой жонкі, і Ала, калі Саша не бачыў, паварочвала яго «тварам» да акна. А калі забывалася гэта зрабіць, то, прачнуўшыся раніцай, сутыкалася з іранічнай усмешкай іншай жанчыны.

...Часам па вечарах Саша знікаў. Нічога не тлумачыў, проста папярэджваў: «Не чакай, кладзіся спаць. Гэта па рабоце. Буду заўтра». І назаўтра сапраўды з'яўляўся — заўсёды ў добрым настроі. Вечарам абавязкова вёз Алу ў рэстаран — «пакуціць». Ён не гаварыў ёй слоў кахання. Яна навучылася слухаць і разумець сэрцам. І чытаць па вачах.

У адзін з такіх бесклапотных вечароў ён сказаў ёй як бы між іншым: «Заўтра я дам табе адрас аднаго офіса — яны гандлююць камп'ютарамі. Ты зойдзеш туды як звычайны пакупнік і пацікавішся, што за тавар там прадаюць. Мадэлі, вытворцы, кошт і гэтак далей... І вернешся дадому. Згодна?»

Ала кіўнула галавой, бо не хацела задаваць пытанні, баялася іх задаваць. За некалькі месяцаў, праведзеных разам з Сашам, яна паспела зрабіць некаторыя высновы наконт таго, адкуль у яго з'яўляюцца грошы. Ён рэдка хваваў свой дыпламат, «набіты» ключамі ўсялякіх памераў і канфігурацый, а таксама іншымі цікавымі прыстасаваннямі. І ўжо не зачыняўся з сябрамі на кухні, калі раздавалі «зарплату». «Сябры» былі ўвогуле зусім не падобныя на Сашу, і каб не ён, Ала наўрад ці змагла б выносіць іх прысутнасць больш за хвіліну. Саша ў прысутнасці «калег» таксама рабіўся іншым і размаўляў па-іншаму — рэзка і груба. Калі ёй выпадала заходзіць у пакой, дзе абмяркоўваліся дэталі нейкай справы, ён замаўкаў і апускаў галаву.

Аднойчы яго прыяцель-падначалены — картаканог «качок» з квадратнай сківіцай і чырвоным тварам — падлавіў Алу на кухні і, абазваўшы Сашу непрыстойным словам, пацікавіўся, ці не хоча яна памяняць «сэксуальнага партнёра». «Магчыма, — адказала яна. — Але мяняць яго на дэбіла я не збіраюся». «Качок» нецэнзурна выляўся, паабяцаўшы пры сустрэчы адзін на адзін «адарваць ёй ногі». І Але стала па-сапраўднаму страшна.

Ноччу яна доўга не магла заснуць, спрабавала адказаць самой сабе на пытанне: што яна, дзяўчынка з прыстойнай сям'і, школьная выдатніца, тут робіць? Якое зацьменне найшло і прымусіла не заўважаць відавочнае? Яна даўно не была ў бацькоў, адвыкла ад сябровак, ад сваёй кватэры... Ключы, як заўсёды, ляжалі ў прыхожай. Да дзвярэй было некалькі крокаў. За імі — свабода.

...Раніцай яна знайшла на століку запіску: «Давай паабедаем разам. Абяцаю сюрпрыз».

На абед Саша не з'явіўся. Не прыехаў ён і на вячэру, і ўвогуле — начаваць. Ноч Ала правяла стоячы ля акна, утаропіўшыся ў асветленую нежывым жоўтым святлом палоску асфальту ля ўваходу ў пад'езд. А раніцай у дзверы патэлефанавалі. Рэзка і працягла. Саша так не званіў ніколі. І ўсё ж гэта было лепш чым нічога. Людзі «ў цывільным» паказалі ёй свае пасведчанні і папрасілі праехаць з імі, каб адказаць на некалькі пытанняў...

Ала баялася толькі аднаго — што яе не адпусцяць. І ўпарта паўтарала ў кабінеце следчага: «Нічога не ведаю. Я — звычайная шлюха. У Сашы таксі, можа, з дзесятак». У канцы дня яе адпусцілі. Вярнуўшыся на кватэру, яна «села» на тэлефон і пачала абзвоньваць родных і знаёмых. Ёй патрэбны быў адвакат, здольны выцягнуць Сашу з бяды.

І такога знайшлі. Праўда, сума, якую ён назваў, аказалася разоў у дзесяць больш за тую, якую пачылала мэтазгоднай яна сама. Забыўшыся на жаночы гонар, Ала пайшла на «паклон» да былой Сашавай жонкі. Ёй паказалі на дзверы... У бацькоў — Ала ведала — грошы лепш не прасіць. Яны ўсё жыццё выхоўвалі яе паводле маральнага кодэкса таго грамадства, якое так ніхто і не пабудаваў. Ды нават калі б мама і зразумела, і паспачувала — адкуль было ўзяць тыя тысячы долараў?

Заставаўся яшчэ адзін варыянт — кватэра, тая самая, бабуліна падарунак. (Сама бабуля пераехала жыць да Аліных бацькоў, пацясніўшыы іх у двухпакаёўцы.) Ала практычна не раздумвала, прадаваць яе ці не. Яна больш хвалявалася за тое, каб грошы, атрыманыя за «нерухомасць», зрабілі сваю галоўную справу, і Сашу адпусцілі пад падпіску аб нявыездзе.

Адвакат патэлефанаваў ёй праз месяц, сказаў, калі і куды падысці, каля якога выхаду чакаць Сашу. «Пасля гэтага ён павінен будзе знікнуць з горада, яшчэ лепш — з краіны», — адвакат некалькі разоў паўтарыў гэту фразу. Ала ўжо ведала, што паедзе з Сашам куды заўгодна, калі той пакліча.

...Ад'язджалі яны праз некалькі дзён — у суседнюю краіну па чужых дакументах... Ала забегла да мяне развітацца. Абняла... Вочы свяціліся ад шчасця. «Калі Саша не забудзе апошнюю параду свайго адваката, усё будзе цудоўна. Чакай праз год!»

***

— І вы сустрэліся? — спытала пісьменніца.

— Праз год — так. А больш — не. Яна не хацела сюды прыязджаць. Ад яе адвярнуліся сваякі, сябры... Аднойчы яна патэлефанавала мне. Расказала, што двойчы рабіла аборт, а потым адзін з падзельнікаў Сашы моцна парэзаў ёй нагу, і таму, напэўна, яна прыедзе на некалькі дзён дадому, каб паказацца хірургам.

— А што перад ад'ездам сказаў ім адвакат?

— Не ім, а яму. Ён сказаў: «Беражы яе. Такіх жанчын не бывае».

— І вы так думаеце? — у пытанні пісьменніцы пачуліся іранічныя ноткі. — Бываюць. Проста каханне не прыходзіць да скептыкаў, да тых, хто ўсё жыццё цэмпаваліць, і не верыць нават самому сабе. Яно любіць, калі яго чакаюць, ніколі не зачыняючы душу. А спазнаць яго дадзена кожнаму: і праведніку, і грэшніку...

Я палічыла гэта пачаткам інтэрв'ю і ўключыла дыктафон...

Наталля УЛАДЗІМІРАВА.

Добрыя людзі

СТРАЛЬЦОЎ І ГРЫБЫ

Міхась Стральцоў пагадзіўся напісаць новую прадмову да майго, забароненага савецкімі цэнзарамі, зборніка вершаў. Я зайшоў да яго, каб абмеркаваць далейшы лёс нешчаслівай кніжкі. Стральцоў прачытаў мне прадмову, і мы выйшлі на гаўбец перакурыць. Быў цёплы сонечны дзень ранняй восені. «Трэба нам з табою ў грыбы выбрацца. Я тут, пад Ракавам, ведаю грыбныя мясціны...» — Стральцоў расказваў і расказваў пра нашую паездку ў лес, а я думаў зусім пра іншае. Якія грыбы? Што гэта за падлеткаўскія летуценні? Не паеду я ў грыбы. Трэба працаваць: пісаць карціны, афармляць кнігі. Трэба грошы зарабляць. «Калі паедзем?» — спытаў Стральцоў. «Не ведаю...» — «Як знойдзеш час, заходзь, і мы паедзем...» Не знайшоў я час, і мы не выбраліся ў грыбы, і я не ведаю грыбных мясцінаў пад Ракавам. Стральцова даўно няма. Часам я перачытваю ягоныя вершы і кожнага разу шкадую, што не схадзіў з ім у тыя грыбы.

АНТОН І ПРАГУЛЯНКА

Ёсць гісторыі, якія заўсёды знаходзяць працяг. Згадайце ў кампаніі сяброў, як згубілася і знайшлося вашае дзіця, і пачуеце расповед пра падобнае здарэнне. Мае знаёмыя прыйшлі ў госці. У апошні момант гаспадыня заўважыла, што ў доме няма хлеба. У краму яна пайшла з сынам знаёмых — шасцігадовым Антонам. У перадсвяточны дзень крама была бітма-набітая народам. Жанчына сказала хлопчыку пачакаць на ганку крамы «Каравай». Пазней Антон скажа, што яму пачулася не «пачакай» а «пагуляй». Антон схітруе. Але тое будзе толькі праз суткі. Жанчына з боханам выйдзе з крамы і не знойдзе Антона. Яна аббегае ўсе вуліцы і дворы вакол пляца Перамогі, але так і не адшукае хлопчыка. З горкім настроем яна вернецца домоў, дзе страціць апошнюю надзею хутка пабачыць Антона. Замест запланаванага і падрыхтаванага банкету дзве сям'і атрымаюць бяссонную ноч са звонкамі ды паходамі ў міліцыю. Што Антон? Яму надакучыла чакаць на крамным ганку, і ён выправіўся на прагулянку. Ад пляца Перамогі ён прайшоў пешкі ажно да вуліцы Янкі Маўра. Там спыніў маладога мужчыну і сказаў, што хоча есці і спаць. Мужчына трапіўся чулы: завёў незнаёмага хлопчыка да сябе дамоў, накарміў і паклаў спаць. Толькі раніцай ён распытаў Антона пра бацькоў і завёў у міліцыю. Гэта ў міліцыі Антон настойваў, што яму сказалі «пагуляць», а не «пачакаць». І колькі яго ні спрабавалі пераканаць у адваротным, ён не пагаджаўся і застаўся стаяць на сваім «пагуляй».

НЯМЦОЎ І ЧАСНОК

Сустрэў... Люблю выпадковыя сустрэчы і кароткія неабавязковыя размовы. У гэткіх, кінутых на прыпынку словах, часам можна ўбачыць усё жыццё чалавека... Сустрэў свайго даўнейшага выкладчыка малявання — Віктара Нямцова. Выглядзеў ён моў стомлены: «Надакучылі бясконцыя святы. Іх столькі, што яны ўжо не весяляць а стамляюць». — «Хіба з-за гэтага варта засмучацца. Во да мяне сягоння натуршчыца не зможа прыйсці, а я ўсё адно не расстройваюся. Пайду ў майстэрню і намалюю нац

Хто каго?

«ДЗЕЎКА ХЛОПЦУ ЗАГАДАЛА: *Пакажы, які герой...»*

Загадка. З канверта. Спадар Дубовік з Бярэзіншчыны запытаў, што гэта такое: плюралізм, дэмакратыя, канкурэнцыя і ўсе задаволены?

Не, гэта не краіна такая (сам жа ён і адказвае), не лад які-небудзь, бо няма ж, відаць, ні краіны, ні ладу, каб спрэс, усім даспадобы быў?.. Гэта — конкурс наш на лепшы подпіс да здымка. Яно ж і сапраўды — што ні думка — усе розныя: чым не плюралізм? Чым не канкурэнцыя, калі перамагчы ці хоць надрукавацца прагне кожны? Сто працэнтаў дэмакратыя — пераможцаў вызначаюць самі чытачы. Фразу ж «усе задаволены» — працягвае Міхаіл Паўлавіч — нават тлумачыць не трэба, бо конкурс вельмі цікавы — не толькі для ўдзельнікаў. І для чытачоў: у год здароўя я кожнаму параіў бы бережліва захоўваць усе публікацыі, каб

потым, калі, не дай Бог, заняможацца ці сапсуецца настрой, — зноў перачытваць. На сабе праверыў — дапамагае лепш, чым таблеткі».

Натхнёныя такой вось высокай адзнакай, і распачнём мы чарговы агляд. Прычым — не з відавочнага:

П'яным з вечара не быў,
Але воду прагна піў...

Піць яе — вось так, з вядра — і па іншых прычынах можна. Ну па-першае (прызнае Мікола Старых з Гомеля):

Не выходзіць венскі вальс,
Полька-весялуха,
Калі кішкі граюць марш
І ў роце суха.

Вось і прыклаўся чалавек.

Чаму да вядра, вядае спадар Гарбачоў з Сенненшчыны:

Здаўна ў вёсках, як і сёння
З вёдзер п'юць зазвычай коні...
Як той конь, — музыка стаў:
Нехта конаўку украў.

Дурныя часы — украсці насамрэч могуць. І ўсё што заўгодна. Альбо па прымусу забраць. Як? Ведаюць ці не ўсе. А вось пішуць — муж і жонка Астроўскія з Мінска:

Прызнавацца нават горка —
За ваду з пяском і хлоркай
Грошы — вымі й заплаці.
Да таго ж — пракіпяці.

Крыўдна! А некалі...

Ні лічыльнікаў, ні труб.
А стаяў драўляны зруб
І бяры... Колькі заўгодна
Вады чысценькай, халоднай.

Прычым конаўкай — яна тады на месцы была...

Але ж ці тое будзе? Нават з вадой. Не выключана ж, што і на ёй

Прыйдзе час (куды дзявацца?)
Нехта стане нажывацца:
Павязе па загранiцах,
Бо гаючая ж вадзіца.

З гэтым вызначэннем нашага калодзежнага багацця цалкам згодная і спадарыня Чыгрынава з Вілейшчыны:

Няма лепшага напою,
Чым вядро з жывой вадою!
П'еш удосталь, п'еш ад пуза.
І ў нырках цяжкім грузам
Ні той хлоркі, ні нітрату...
Налягай... Пакуль без платы.

Якраз гэта, паводле меркавання аўтаркі, музыка са здымка і робіць. Тым больш што

Дужа ж хлопца змарнавалі:
«Грай!» — крычалі ды скакалі.
Каб не вырваўся хлапец,
Мог бы здарыцца капец, —

піша Раіса Васільева з Гомеля.

І гэта, між іншым, не нейкі там адзінкавы выпадак. А тэндэнцыя, можна сказаць, якую вельмі дакладна абмалявалі сухэнцы Астроўскія:

Хлопец доўга йграў народу,
Як насіла Галя воду...
Людзі любяць слухаць песні...
А вось выпіць —
не прынеслі.

Значыць, музыка бедны неяк сам да студні дапоўз. Адзін... Хоць (паводле меркавання В.А. Гудачковай з Жыткавічаў) граў ён разам з сябрамі. Больш за тое, яны —

На музычным
фестывалі
Першынство заваявалі.
Поспех трэба замачыць,
Каб яшчэ раз
